Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не зарочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі паперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі паперад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя ня 50 проц. даражэй. Зьнізіх тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 67 (2556) Аўторак, 26-га сакавіка 1929 г.

Адкрытае выступленьне сацыял-дэмакратаў супроць рабочых.

ЗАБАРОНА СХОДАЎ І ДЭМАНСТРАЦЫЙ.

БЭРЛІН, 24-3. Пруські міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Грэзінскі ўчора агаласіў пад загалоўкам „апошняя перасьцярога» афіцыйнае паведамленьне, у якім, спасылаючыся на сутычкі, якія адбываліся ў апошні час паміж паліцыяй і рабочымі, заяўляе: «я буду бязьлітасна ўжываць у адносіне да радыкальных арганізацый усе сродкі, якія маюцца ў маім распараджэньні. Пры гэтым я ня спынюся перад роспускам нават такіх саюзаў і аб'яднаньняў, якія аднача-сова зьяўляюцца палітычнымі партыямі.

Інструкцыі, разасланыя Грэзінскім, прадугледжваюць забарону паліцыяй усіх сходаў пад адкрытым небам і працэсій, якія могуць стаць пагрозаю для грамадзкай бязапасьнасьці.

Сходы ў зачыненых памяшканьнях, «бурны характар» якіх загадзя відомы, павінны быць таксама забаронены. Сходы, якія пасьля адчыненьня набываюць «бурны» характар, павінны быць распушчаны.

СПРОБА ПРЫДУШЫЦЬ КАМУНІСТЫЧНЫ РУХ.

БЭРЛІН, 24-3. Ня гледзячы на тое, што ў афіцыйным паведамленьні і інструкцыях Грэзінскага ніводным словам не спамінаецца нямецкая кампартыя і чырвоны саюз франтавікоў, аднак яны ўсёй палітычнаю грамадзкасьцю разглядаюцца як накіраваныя выключна супроць нямецкае камуністычнае партыі і чырвонага саюзу франтавікоў.

Органы партыі цэнтру вітаюць інструкцыі Грэзінскага дэмакратычны-ж друк і эсдэкаўскі „Форвэртс» сьвядома не абгаварваюць іх. «Ротэ-Фанэ» выяўляе, што пагроза накіравана выключна супроць чырвонага саюзу франтавікоў і кампартыі і азначае пачатак падрыхтоўкі дыктатуры Гугенбэрга.

Газэта падкрэсьлівае, што непасрэднаю прычынаю выступленьня міністра зьяўляюцца мядаўнія перамогі рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў. «Ротэ-Фанэ» заяўляе, што кампартыя не дае сябе застрашыць пагрозамі і заклікае рабочыя масы адказваць на пагрозы Грэзінскага выбарамі рэвалюцыйных фабзавкомаў і ўзмацненьнем руху пратэсту супроць асаднага становішча, а таксама масавым уступленьнем у кампартыю і саюз франтавікоў.

АСАДНАЕ СТАНОВІШЧА Ў БАЗЭЛІ

БЭРЛІН, 24-3. Як паведамляюць з Бэрна, горад Базэль сёньня фактычна знаходзіцца на асадным становішчы. Войска вакол гораду, радыусам у 25 кілёмэтраў, знаходзіцца ў баявой гатоўнасьці.

Сацыял-дэмакратычны старшыня ўраду ў Кантоне агаласіў загад, які забараняе ўсе сходы, працэсіі і прамовы пад адкрытым небам, а таксама нашэньне формы швэйцарскага саюзу рабочае абароны.

Паліцыя канфіскавала ўвесь тыраж камуністычнага органу „Вазлер Форвэртс» за «заклік да забароненых дзеяньняў». Рабочым і служачым дзяржаўных устаноў забаронена ўдзельнічаць у дэманстрацыі пад пагрозай звальненьня.

ПЕРАМОГА ЛЕВАГА РУХУ Ў РУРЫ.

БЭРЛІН, 23-3. Па першапачатковых вестках аб выбарах у фабзавкомы на горна-прамысловых прадпрыёмствах Рурскае вобласьці, левае рэвалюцыйнае крыло атрымала ўсюды значную перамогу.

Кіраўнікі левага крыла заклікаюць нанова абраныя рэвалюцыйныя фабзавкомы глядзець на сябе, як на арганізатараў бацьцьбы, якая павінна пачацца ў горна-прамысловасьці ў пачатку мая (г. зн. пасьля тэрміну зараз дазволенічаючых згод).

Для арганізацыйнага аб'яднаньня нанова абраных фабзавкомаў склікаюцца канфэрэнцыі фабзавкомаў ва ўсіх раёнах Рурскае вобласьці.

ЦК кампартыі Нямеччыны супроць правакацыі сацыял-дэмакратаў.

БЭРЛІН, 24-3. У сувязі з загадам сацыял-дэмакратычнага міністра ўнутраных спраў Прусіі Грэзінскага цэнтральны камітэт нямецкае кампартыі зьвярнуўся да ўсіх арганізацый і членаў партыі з дырэктывамі, у якіх прапануе растлумачыць усей нямецкай рабочай клясе, што загад Грэзінскага зьяўляецца адкрытай пагрозай забароны нямецкае кампартыі, чырвонага саюзу франтавікоў і ўсіх рэвалюцыйных арганізацый. Загад сьведчыць аб гатоўнасьці ўрадавае сацыял-дэмакратыі задушыць клясава-сьвядомы рабочы рух мэтадамі фашысцкае дыктатуры. Камуністычная партыя не аслабіць ні на ёту барацьбы за інтарэсы пралетарыяту ні пад якім націскам рэакцыйных пагроз і прымусовых мерапрыёмстваў. Усякае адступленьне перад рэакцыяй, усякая тактыка палахлівае капітуляцыі азначала-б здрадніцтва рабочае класы. Усе партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць узмоцненую агітацыю ў шырокіх масах ва ўсіх акругах шляхам арганізацыі адкрытых масавых сходаў і дэманстрацый пад адкрытым небам і мабілізаваць рабочых супроць пагрозы забароны.

БУЙНЫЯ ПЕРАМОГІ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КРЫЛА Ў ФАБЗАВКОМАХ.

БЭРЛІН, 24-3. Водлуг папярэдніх даных аб выніках перавыбараў фабзавкомаў на прадпрыёмствах горнае прамысловасьці ў Рурскай вобласьці, колькасьць фабзавкомаў, якія знаходзяцца пад уплывам рэвалюцыйнага крыла, па меншай меры павялічылася ў 2 разы.

Маюцца вынікі выбараў на 32-х капальнях з гэтых 47. З 53.100 галасоў, пададзеных на перавыбарах, рэвалюцыйнае крыло атрымала 19.930 галасоў, сьпісы рэфармістаў — 19.180, сьпісы хрысьціянска-сацыяльных прафсаюзаў—12.750, сьпісы бірж дукераўскіх прафсаюзаў—246, жоўтых прафсаюзаў—780 і сьпісы сындыкалістаў—190 галасоў.

Гэтыя даныя толькі частковага характарызуюць уплыў рэвалюцыйнага крыла, бо ў сьпісах выстаўленых незалежнымі прафсаюзамі таксама маецца шмат кандыдатаў рэвалюцыйнага крыла. Вынікі перавыбараў фабкому на мэталёвых прадпрыёмствах «Васхумскія аб'яднаныя мэталёвыя заводы», дзе рэвалюцыйнае крыло ўпяршыню выступала сёлета, наступныя: за сьпіс рэвалюцыйнага крыла пададзена 3000 галасоў. Рэфармісты атрымалі 2400 галасоў, сялянска-сацыяльны саюз атрымаў 1.150 галасоў.

Да гэтых выбараў рэвалюцыйнае крыло мела ў фабкоме толькі аднаго прадстаўніка, а зараз мае 10, тады як рэфармісты толькі 7 чалавек.

Новыя выбары ў саксонскі ляндтаг

БЭРЛІН, 23-3. На скарзе сацыял-дэмакратычнае фракцыі саксонскага ляндтагу вярхоўны дзяржаўны суд абвясьціў несапраўднымі выбары, якія адбыліся 21 кастрычніка 1926 г. у саксонскі ляндтаг, і загадаў назначыць новыя выбары. Скарга грунтавалася на тым, што ў часе выбараў г. зв. «старая сацыял-дэмакратычная партыя» (правая), дзякуючы незаконным манэўрам, атрымала 4 мандаты, якія адыгралі рашаючую ролю ў складаньні сучаснай рэакцыйнай урадавай кааліцыі Саксоніі. (У саксонскім ляндтагу буржуазныя партыі маюць разам 48 месц, сацыял-дэмакраты—31 месца, камуністы 14 месц і «старыя сацыял дэмакраты»—4 месцы). «Ротэ Фанэ» заўважае, што саксонская арганізацыя партыі, ачышчаная ў апошні час ад правых, гатова да перавыбарчай барацьбы, пры якой яна ня будзе шкадаваць ні правых, ні «левых» сацыял-дэмакратаў.

Кулацкія гаспадаркі льготамі не карыстаюцца.

МАСКВА, 23-III, СНК РСФСР зацьвердзіў шэраг адзнак, вызначаючых яўна кулацкія сялянскія гаспадаркі, якія ня будуць вызваляцца ад абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам в прыгончаных пасеўных плошчаў, а таксама з распаханых зямельных і цалінных земляў, як гэта прадугледжваецца новым законам аб адзіным сельска-гаспадарчым падатку на будучы год.

Да кулацкіх гаспадарак прылічаюцца ўсе гаспадаркі, якія будуць абкладацца ў наступным годзе адзіным сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, а таксама, якія сыстэматычна даюць у наймы складаныя сельска-гаспадарчыя машыны з мэханічнымі рухавікамі.

Апрача шаго, сялянскія гаспадаркі, якія маюць млын, маслабойню, крупарушку, ці іншае прамысловае прадпрыёмства, у якім ужываюцца мэханічныя рухавікі, ці наёмная праца; уладаючыя ветраным, ці вадзяным млынам з дзьвюма ці больш паставамі і нарэшце, арандуючыя такую колькасьць пахатнае зямлі, якое перавышае працоўную норму, ці прамысловыя сады і гароды з сыстэматычным ужываньнем наёмнае працы, усе прылічваюцца да кулацкіх гаспадарак, незалежна ад таго, ці абкладаюцца яны ў індывідуальным парадку.

СНК дазваляе ўрадам аўтаномных рэспублік, краёвым, вобласным і губэрскім выканкомам, у залежнасьці ад мясцовых умоў, уносіць зьмены ў гэты пералік з адзнакаю яўна кулацкіх гаспадарак, прычым прапануе зьвярнуць увагу, каб серадняцкія гаспадаркі ні ў якім выпадку не пазбаўляліся сваіх льгот па сельска-гаспадарчаму падатку.

ПАГРОЗА НОВАЕ ВАЙНЫ Ў КІТАІ

ЛІХАМАННЫЯ ВАЕННЫЯ ПАДРЫХТОЎКІ.

ШАНХАЙ, 23-3. З Ханькоу паведамляюць аб ліхаманных ваенных падрыхтаваньнях. Узброены 6 тысяч кулі.

Банкам, гандлёвым палатам і прадпрыёмствам дадзен загад забраць у ваенны фонд 4 з паловаю мілёны даляраў. У райёне Янлоу ханскае войска будуе крэпасьці з мэтаю арганізаваць тут абаронную базу на выпадак паражэньня на граніцы правінцыі.

Водлуг пастановы зьезду Гаміндану, звольнен з пасады генэрал Ецзі, камандуючы хунанскім войскам.

У пачаканьні генэральскай вайны.

ПЭЙПІН, 22-3. У гутарцы з карэспандэнтам японскага тэлеграфнага агенцтва, начальнік пэйпінскага гарнізону заявіў, што калі вайна паміж Нанкінам і Уханам будзе нямінучай, дык Ен-Сі-Шан будзе садзейнічаць лёкалізацыі канфлікту і вырашэньню яго ў найкарочшы тэрмін. Фын-Юй-Сян таксама падтрымлівае цэнтральны ўрад і будзе супрацоўнічаць з Ен Сі-Шанам. Згрупаваньне войска Фын Юй-Сяна адбылося па загаду цэнтральнага ўраду.

11 ДЭЛЕГАТАЎ ПАКІНУЛІ ЗЬЕЗД ГАМІНДАНУ.

ШАНХАЙ, 23-3. Зьезд Гаміндану пакінулі 11 дэлегатаў у знак пратэсту супроць таго, што тут зьвязваюць свабоду г. зн. групоўкі заходніх узгоркаў (цзыньанская групоўка). Гвардыі, якая ахоўвае ўваходы, неадклад, на быў дадзен загад нікога ня выпускаць і ня ўпускаць на зьезд, ня выключаючы і дэлегатаў.

ВАЙСКОВАЯ НАРАДА Ў МУКДЭНЕ

ХАРБІН, 22-3. У зьвязку з насьпеўшымі ў Кітаі падзеямі ў Мукдэне адбываецца вайсковая нарада, у якой прымаюць удзел Карэйскі, Хэлунцзянскі, Жэхолінскі губэрнатары і інш.

РАЗВАЛ У ГАМІНДАНЕ.

ХАРБІН, 22-3. Правінцыяльныя камітэты па кіраўніцтву партыйнымі справамі ў Керые, Цыцыкары і Мукдэне ўхвалілі рэзалюцыі, у якіх выказваюць недавер'е зьезду Гаміндана пратэстуючы супроць назначэньня дэлегатаў зьезду выканкомам Гаміндану.

ЧАМУ АРЫШТАВАНЫ ЛІ-ЦІ-СІН.

ШАНХАЙ, 23-3. Весткі аб арышце гуансійскага лідэра Лі-Ці-Сіна пацьвярджаюцца. Водлуг паведамленьняў агенцтва «Тохо» арышт Лі-Ці-Сіна ня мае дачыненьняў да хуманьскіх падзей і мае сувязь з выкрытай „палітычнай інтрыгай", якая мае на мэце нанесьці „сьмяротны ўдар" цэнтральнай уладзе

НОВАЕ ПАЎСТАНЬНЕ Ў СІРЫІ.

ПАРЫЖ, 21-3. Водлуг вестак з Канстантынопалю ў Сірыі выбухнула новае паўстаньне супроць французаў. На месца паўстаньня французы мабілізавалі ўсё войска. Пасланы 6 самалётаў.

Існуюць чуткі, што паўстанцамі заняты горад Аленпо.

Пошукі дырыжаблю „Італія".

ОСЛО, 21-III. Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «у Осло прыбыў італьянскі інжынэр Альберціні. Паездка зьвязана з італьянскай экспедыцыяй для пошукаў дырыжаблю „Італія", якую мяркуецца наладзіць улетку.

У Саюзных Рэспубліках.

4 МІЛІЁНЫ НА ПАЛЕПШАНЬНЕ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ.

МАСКВА, 23-3. СНК РСФСР дазволіў Наркамасьветы асигнаваць у сёлетнім бюджэтным годзе 4 міліёны руб. на палепшаньне падрыхтоўкі спэцыялістаў. Гэтыя 4 міліёны рублёў пойдуць на арганізацыю бязупынна вытворчае практыкі, на запрашэньне [illegible] спэцыялістаў, на навуковую працу ВТУЗ'аў, на капітальны рамонт і абсталяваньне студэнцкіх інтэрнатаў, на бягучыя вучэбныя выдаткі ВТУЗ'аў і індустрыяльных тэхнікумаў, на стыпэндыю студэнтам і г. д.

40 проц. усіх рабочых донвугалю пераводзяцца на 7-гадзінны рабочы дзень.

ХАРКАЎ, 22-3. Усеукраінскі камітэт саюзу гарнякоў заслухаў даклад Донвугалю і Юрта аб выніках пераводу прадпрыёмстваў горнае прамысловасьці Украіны на 7-мігадзінны рабочы дзень. З тае прычыны, што пераведзеныя капальні павялічылі здабычу, прызнана неабходным пераведсьці ў 1929-30 г. на 7-мігадзінны рабочы дзень ня менш 40 проц. усіх рабочых занятых на капальнях Донвугалю.

ЦК УсеКП аб працы КСМ.

МАСКВА, 23-3. Агалошана падрабязная пастанова ЦК УсеКП(б) аб чарговых задачах камсамольскае працы і партыйнага кіраўніцтва камсамолам. У пастанове зазначаецца, што камсамол у якасьці бліжэйшага памоцьніка партыі павінен мабілізаваць усе свае сілы і энэргію мас моладзі на дапамогу сацыялістычнаму будаўніцтву і рэканструкцыі народнае гаспадаркі ў горадзе і вёсцы. Але побач з камсамольскімі кіраўнічымі органамі павінны ўзмацніць кіраўніцтва камсамолам партыйныя арганізацыі.

Цьвярская арганізацыя проці паводзін Троцкага

ЦЬВЕР, 22-3. Сход цьвярской гарадзкой партыйнай арганізацыі, на якім прысутнічала 1500 чалавек, заслухаўшы паведамленьне аб антысавецкай дзейнасьці Троцкага заграніцаю ў ухваленай аднагодна рэзалюцыі, між іншым заявіў: «Аддаючы сабе поўную справаздачу ў тым, што трацкізм з ухілу і апазіцыі абярнуўся ў нелегальную антысавецкую плынь, а Троцкі і трацкісты канчаткова адышлі ў лягер контр-рэвалюцыі, у лягер простых ворагаў дыктатуры пралетарыяту і партыі, ужываючых мэтады падпольнае контр-рэвалюцыйнае працы, сход патрабуе ўжываньня ў адносіне да трацкістаў самых суровых мер зьнішчаючых ў корані іх дзейнасьць, накіраваную да падрыву пралетарскае дыктатуры і сацыялістычнага будаўніцтва».

Барацьба з павышэньнем цэн.

МАСКВА, 23-3. Цэнтрасаюз СССР пастанавіў арганізаваць цэнтральную камісію па барацьбе з павышэньнем розьнічных цэн. Апрача выездаў па месцы, камісія будзе выклікаць у Маскву для дакладу старшынь тых канцэратываў, дзе заўважана тэндэнцыя да павышэньня цэн. Вінаватыя ў незаконным павышэньні розьнічных цэн будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Праграма здабычы вугалю выконваецца.

ХАРКАЎ, 21-III. За першыя 15 дзён сакавіка здабыта 1.139 тысяч тон вугалю (49,5 месячнага заданьня), на 128 тысяч тон больш, чым у другой палове лютага. У параўнаньні з першай паловай лютага вытворчасьць працы ў шахтах павялічылася на 5,4 проц.

200 тысяч новых укладчыкаў.

ХАРКАЎ, 23-3. За 20 дзён двухтыднёвіка ашчадкасьці ашчадныя касы на Украіне завербавалі 200 тысяч новых укладчыкаў, якія павялічылі агульную суму ўкладаў на 4 міліёны рублёў.

Новыя адміністрацыйныя адзінкі.

МАСКВА. Прэзыдыум УсеЦВК утварыў спэцыяльную камісію, якая будзе разглядаць пытаньні, зьвязаныя з вылучэньнем гарадзкіх цэнтраў новых вобласьцяў у самостойныя адміністрацыйныя адзінкі. Гэткія цэнтры будуць непасрэдна падначальвацца краёвым ці вобласным выканкомам. У склад камісіі ўвайшлі т. т. Кісялёў, Досеў, Ляжава, Уханаў, Таўмачоў і Пахомаў.

Спэкуляцыя аўсом.

ЛЕНІНГРАД, 23-3. У Ленінградзе выкрыта шмат выпадкаў спэкуляцыі і махінацыі з аўсом. Шмат якія транспартныя арцелі рэгістравалі зьпісы з „мёртвымі душамі", пастаўляючы даўно выбыўшых з іх арцеляў асоб і коняй. Выкрыты таксама асобы, якія маюць патэнт на авёс, але ня маюць коняй. Яны атрымлівалі авёс для спэкуляцыі. Шмат якія асобы і транспартныя арцелі ўмудрыліся атрымліваць авёс у розных дастаўляючых арганізацый.

Абсьледаваньне яшчэ ня скончана, але ўжо зьнята з дастаўкі каля 2 тысяч возчыкаў, у тым ліку некалькі арцеляў.

Апрача таго, адабрана звыш 200 патэнтаў на авёс.

Новы хлебны завод.

КАЗАНЬ, 23-3. Рабочы каапэратыў распачаў пабудову ў Казані хлебнага заводу. Завод будзе выпякаць штодзень 63 тоны хлеба, каб забясьпечыць палову патрэбнасьці ўсяго гораду ў хлебе.

Аэрасанны прабег.

КАЗАНЬ, 24-3. Аэрасані прабылі 2 дні ў Казані, дзе яны былі прадэманстраваны на шэрагу заводзкіх прадпрыёмстваў. На досьвітку 24 сакавіка двое галоўных аэрасанак рушыліся ў Чэбаксары, куды прыбылі ў 14 гадзін дня. Удзельнікам прабегу было наладжана гарачае спатканьне працоўнымі Чэбаксар. На адбыўшымся мітынгу выступалі члены ўраду Чувашскае рэспублікі. 25 сакавіка а 8 гадзіне раніцы аэрасанкі накіраваліся на напрамку на Макар'еўск—Ніжні-Ноўгарад. Адліга і ліпкі сьнег вельмі затрымліваюць пасоўваньне наперад. Прыбыцьцё аэрасанак Цагі ў Ніжні чакаецца ва ўторак 26 сакавіка. Аэрасанкі Нані пад кіраўніцтвам Водзячага Караля вышлі на досьвітку 25 з Казані. Другія аэрасанкі Нані пад кіраўніцтвам Шчэрбакова вышлі 24 сакавіка з Іжэўска ў Казань.

Абвал капальні.

АРЦЁМАЎСК, 22-3. Сёньня ў 12 гадзін дня на пласьце Мазурка Гарноўскага рудніка № 8 здарыўся абвал вугалю. Ужыты энэргічныя меры да выратаваньня забойшчыкаў, якія засталіся ў уступах. На руднік выехаў загадчык і старэйшы інспэктар Акруговага Аддзелу Працы.

Залежы жалеза ў Карэліі.

ЛЕНІНГРАД, 22-3. Біялёгічны інстытут распачынае разьведку залежаў жалезных і медзяных руд Карэліі. Разьведкі будуць скончаны да восені. Залежы жалезных і мядзяных руд Карэліі павінны зьявіцца сыравінай базай для ленінградзкай мэталюргічнай прамысловасьці. У Карэліі будзе пабудован завод для выплаўкі чыгуну.

Вынікі шторму.

МУРМАНСК, 22-3. У часе нядаўняга шторму ў акіяне пацярпелі аварыю 27 рыбалоўных суднаў. Да іх выратаваньня былі ўжыты самыя энэргічныя меры. 23 судны выратаваны, 3 знаходзяцца ў цяжкім становішчы. Работа па іх выратаваньню яе спыняецца. Адно судно загінула.

Багаты ўлоў селядцоў.

УЛАДЫВАСТОК, 22-3. 19-га сакавіка пачаўся ход селядцоў. Селядцы ідуць надзвычайна густымі [illegible]мі. У бухце Майтун за два дні на промыслах прыморскага Рыбаксаюзу вылаўлена 3 мільёны штук. Асобныя арцелі вылаўліваюць па 500 тысяч штук. Рыбаю запоўнены ўсе засольныя чаны і невады. Шмат селядцоў ляжыць проста на беразе. Не хапае бочак. У Усурыйскім заводзе селядцы ідуць валам. Частка рыбалак прызнала вясеньні ход селядцоў.

У панскай Польшчы.

ЯК УТВАРАЎСЯ „ПАТРЫЁТЫЗМ" ПОЛЬСКАГА ДРУКУ.

ВАРШАВА, 17-III. Шмат шуму выклікаў надрукаваны у «АБЦ» ліст генэрала Гальлера, начальніка генэральнага штабу ў 1920 г. У гэтым лісьце Гальлер гаворыць, што пасьля паражэньня польскага войска ў ліпені 1920 г. у часе польска-савецкае вайны, краіну ахапіла роспач.

Насельніцтва страціла бадзёрасьць і надзею, неабходна была дапамога друку для ўзьняцьця «патрыётычных пачуцьцяў».

Гальлер зьвярнуўся за дапамогаю да вярхоўнага камандаваньня, якое яму адказала, што «бяз грошай, бяз значных крэдытаў для друку нельга будзе правесьці такую кампанію». І сапраўды, рэдакцыям газэт былі выдадзены буйныя сумы для таго, каб яны друкавалі патрыётычныя артыкулы.

На ліст адгукнуліся толькі дзьве газэты, «АБЦ» заявіла, што «факты готы—страшэнны і згубны і мы пераканаены, што ўвесь польскі друк не супакоіцца да таго часу, пакуль на ім будзе ўстаноўлена, якія газэты ўзялі грошы з фонду вярхоўнага камандаваньня для ўзьняцьця духу народу». У такім жа духу адгукнулася на ліст Гальлера і газэта «Рэчпаспаліта». У іншай прэсе ліст Гальлера не знайшоў водгуку. Газэты красамоўна маўчаць... (ТАСС).

ЗЬМЕНЫ Ў ПОЛЬСКАЙ АРМІІ.

Згодна паведамленьня польскіх газэт, у бліжэйшы час адбудуцца вялікія зьмены ў афіцэрскім складзе польскай арміі.

У распараджэньне асобных камандзіраў ваенных акругаў пасылаецца каля 500 афіцэраў. Віцэ-міністр вайсковых спраў генэрал Канажэўскі выходзіць у адстаўку. Робіцца шэраг перасоўваньняў, прычым на найбольшыя адказныя пасады выпучаюцца асобы блізкія да генэральнага інспэктара.

Для фабрыкантаў у Польшчы закон ня пісан

ВАРШАВА, 17-3. Уласьнік буйнейшае тэкстыльнае фабрыкі «Видзевская мануфактура» (то самай, дырэктар якой Альбэрт Кон застрэліў звольненага рабочага Цэсінскага, які пасьпеў адказаць стрэлам на сьмерць параніўшым забойцу) Оскар Кон і сын яго Макс Кон, а таксама два дырэктары фабрыкі былі некалькі дзён таму назад прысуджаны да 10 дзён арышту за антысанітарнае становішча прадпрыёмства. У адказ на гэта Оскар Кон прыгразіў, што калі прысуд будзе выканан, дык ён зачыніць фабрыку і выкіне на вуліцу 9 тыс. рабочых. Пагроза мела свой уплыў і прысуд, водлуг чутак, будзе адменен.

КАТАСТРОФА ШКОЛЬНАГА ПОЕЗДУ.

ТОРН. 19-га сакавіка школьны поезд, які ішоў з Сьмятова, сустрэўся на поўным ходзе з таварным поездам. 4 вагоны былі разьбіты. Паранена 15 чалавек. 3 іх 2 цяжка.

МАСЫ СУПРОЦЬ ДЫКТАТУРЫ Ў ЮГАСЛАВІІ.

ВЕНА, 23-3. У Загрэбе на адным з вуліц забіт стрэлам з рэвальвэру Шлегель—дырэктар буйнейшага югаслаўскага газэтнага прадпрыёмства «Югостампа», член фашысцкае арганізацыі «белая рука». „Югостампа" выдае між іншым загрэбскія газэты «Новости» і «Загребер Морген блат» і падтрымлівае ў Югаславіі ваенную дыктатуру.

Гэтае забойства лічаць пакаязьнікам настрояў шырокіх колаў харвацкага насельніцтва, якія расчараваліся ў лідэрах ранейшых апазіцыйных партый Харваты, якія вядуць згодніцкую палітыку ў адносіне да дыктатуры.

Адначасова паведамляюць, што прадугледжанае па парадзе Англіі і Францыі, падарожжа югаслаўскага каралі ў Загрэб адкладзена, бо загрэбская ўлада заявіла, што не бярэ на сябе адказнасьці за бязапасьнасьць караля. У вязьбу з забойствам Шлегеля, загрэбская паліцыя ўчыніла шэраг вобыскаў сярод прыхільнікаў харвацкіх фэдэралістаў.

ВЫЕЗД У МАСКВУ ДЭЛЕГАЦЫІ АНГЕЛЬСКІХ ПРАМЫСЛОВЦАЎ.

ЛЁНДАН, 25-3. Рэйтэр паведамляе: «Сёньня выехала з Лёндану ў Маскву дэлегацыя ангельскіх прамысловцаў.

Тав. АРОСЕЎ—У ЧЭХА-СЛАВАКІІ.

ПРАГА, 22-3. Новы паўнамоцны прадстаўнік СССР у Чэхаславакіі Аросеў перадаў міністру замежных спраў Бэнэшу вярыцельныя граматы.

Рост савецка-амэрыканскага гандлю.

НЬЮ-ЁРК. Па паведамленьню Амгандлю, у працягу чатырох месяцаў—з 1 кастрычніка 1928 г. па люты 1929 г.—ім закуплена для адпраўкі ў СССР амэрыканскіх тавараў на суму 11 міліёнаў даляраў. Па думцы Амгандлю, савецкія пакупкі ў ПАЗШ у працягу 1929 г. перавысяць пакупкі ў 1928 г. прыблізна на 30 проц.

У афіцыйным органе міністэрства гандлю ПАЗШ «Коммэрс Рэпорц» агалошаны падрабязныя весткі аб замежным гандлі СССР у 1927 г. прычым асаблівая ўвага зьвернута на пашырэньне савецка-амэрыканскага гандлю.

ШПІЁНАЖ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ ПАЦЬВЯРДЖАЕЦЦА.

БЭРЛІН, 23-3. Як паведамляе, «Вольт ам Абэнд» даныя паліцэйскага сьледзтва па справе аб фабрыкацыі фальшывак умацавалі падазрэньні ў шпіёнажы Гуманскага і Росмана прэсіў Нямеччыны. На наступным тыдні абодвы будуць перададзены судовану сьледзтву.

Сутычка камуністаў з паліцэйскімі.

ПАРЫЖ, 24-3. Агенцтва Гавас паведамляе: „паліцэйскія, жадаючы арыштаваць чужаземных рэвалюцыянэраў, зьявіліся на камуністычны сход, які адбываўся ў Клішы (прадмесьце Парыжу). Камуністы далі адпор і ў сваю чаргу напалі на паліцэйскіх. Паліцыя арыштавала ўсіх камуністаў. 20 камуністаў знаходзяцца пад вартай. Адзін паліцэйскі паранены".

Абарона фашызму ў Швэйцарыі.

БЭРЛІН, 22-III. Як паведамляюць з Бэрна ў Базэлі згодна просьбы буржуазна-кааліцыйнага ўраду Базэльскага кантону згрупаваны буйныя вайсковыя сілы ў сувязі з забаронаю анты-фашысцкае дэманстрацыі. Лідэр камфракцыі заявіў на пасяджэньні парляманту Базэльскага кантону, што анты-фашысцкая дэманстрацыя адбудзецца абавязкова.

Барацьба ў Аўганістане.

ТЭРМЭЗ, 20-3. Водлуг паведамленьняў прыбыўшых з Аўганістану ў райёне Тагао (паўднёва-ўсходні кут Кугістану) пачалося паўстаньне супроць ураду Хабібулы. Паліцыя Надзір-хана ў адносіне да Амапулы яшчэ ня высьветлена, але ўжо ясна, што ён выступае супроць Хабібулы.

Паведамляюць, што Надзір-хан, у адказ на запрашэньне Хабібулы прыехаць у Кабул, прапанаваў Хабібуле выехаць з Кабулу, пакінуўшы там каштоўнасьці, зброю і грошы. Абраны адказам Надзіра, Хабібула даў на поўнае абрабаваньне дом Надзіра-хана ў Кабуле.

* * *

ТЭРМЭЗ, 20-3. У горадзе Майменэ (паўночны Аўганістан) атрыманы весткі аб падрыхтоўцы губарнатарам Андхоя перавароту на карысьць Хабібулы. Маймонскі генэрал-губарнатар выслаў у Андхой атрад, які арыштаваў там губарнатара і некалькіх камісараў Хабібулы.

НЯЎДАЧА ФРАНЦУСКАГА БАНКУ Ў АМЭРЫЦЫ.

НЬЮ ЁРК. 23-3. Абвешчана прыватная пастанова суду па іску французкага банку да нью-ёрскіх банкаў «Нэйшэнэл Чэйз Банк» і «Эквітэбл Трэст К°», аб прызнаньні за ім права ўласьнасьці на савецкае золата ў сумі 5 міліёнаў даляраў якое ўвозілася ў мінулым годзе ў Злучаныя Штаты і дэпаніравалася ў спамянёных банках. Намаранкор кадайніцтву французкага банку, пастанова суду прызнае за адказчыкамі права спасылацца ў адхіленьні іску на довады міжнароднае-прававога характару.

У колах судовых дзеячоў лічаць, што гэтая прыватная пастанова суду мае галоўнае значэньне для надыходзячага рашэньня па сутнасьці іску. У палітычных і дзелавых колах выдказываюць, што адмова ў іску французкага банку будзе вельмі важнае значэньне для далейшага разьвіцьця дачыненьняў паміж СССР і Злучанымі Штатамі. Гэтая пастанова азначае, што золата, увезімае ў Злучаныя Штаты з СССР, не падлягае арышту па дарэвалюцыйных пратэнзіях. (ТАСС)

НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

Праз 3 тыдні-месяц пачнецца сяўба.

Гэта будзе ня звычайная пасеўная кампанія. Гэта будзе праверка ўсіх нашых арганізацый на вёсцы, іх здольнасьці ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і савецкае ўлады, іх сувязь з масамі і ўменьня ўплываць на апошнія.

Што зрабілі для пасеўнай кампаніі ячэйкі, сельсаветы, зямельныя камісіі сельсаветаў, хаты-чытальні, камітэты ўзаемадапамогі?

Што зрабіў настаўнік у дапамогу гэтай кампаніі? Ці аказаўся ён на вышыні культурніка на вёсцы, ці прытрымліваецца правіла—«мая хата з краю—я нічога ня ведаю»?

Ці рабіў што-небудзь дэлегацкі нумк? Па ўсе гэтыя і шэраг іншых пытаньняў адкажа вясеньня сяўба.

Да сяўбы засталося мала часу. Што неабходна і можна яшчэ зараз зрабіць у падрыхтоўцы да сяўбы?

1) Трэба праверыць, ці забясьпечаны старыя і новаарганізаваныя калектывы пасеўным матар'ялам, інвэнтаром, цягавай сілай, угаеньнямі і ці ўжыты імі ўсе захады для выкарыстаньня ўсяе плошчы.

2) Трэба ўзмацніць працу па ачыстцы насеньня ў сялянскіх гаспадарках. Праверыць, ці ўсе вёскі ахоплены зернаачышчальнымі абозамі і ці дастаткова выкарыстоўваюцца апошнія.

3) Неабходна на сходах у хатах-чытальнях і шляхам групавых гутарак растлумачыць значэньне сельска-гаспадарчага падатку і льгот, якія даюцца для тых, хто пашырае плошчу пасеваў.

4) Неабходна арганізаваць выкарыстаньне неапрацаваных далёкіх вучасткаў.

5) Камітэты ўзаемадапамогі павінны арганізаваць дапамогу беднаце насеньнем, інвэнтаром, цягавай сілай. Трэба арганізаваць калектыўную дапамогу ў сяўбе ўдовам, сіротам, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам і г. д.

Працы шмат.

Увесь вясковы актыў павінен быць тэрмінова прыцянут да гэтае працы.

Не меркаваць і думаць, а рабіць—асноўны лёзунг моманту.

Часу мала.

Трэба пасьпяшыць.

Саюзы—у паходзе за ўраджай.

АСЬВЕТНІКІ НАБЫВАЮЦЬ ТРАКТАР.

Шэфтаварыства менскіх асьветнікаў у падшэфным сельсавеце арганізавала для сялян сельска-гаспадарчыя курсы, на якіх прапрацоўваюцца пытаньні пасеўнай кампаніі і падвышэньня ўраджайнасьці. У сельсавеце працуе абоз па ачыстцы насеньня і прадстаўнік шэфтаварыства ў час працы праводзіць сярод сялянства растлумачальную работу.

Шэфтаварыства закладае таксама на сельсавету 3 паказальныя вучаткі і будзе заложаны пры мясцовай школе пладавы гадавальнік. Побач з гэтым шэфтаварыства накіроўвала ў вёскі сельсавету звыш 300 кніжак сельска-гаспадарчай літаратуры

Мае на ўвазе шэфтаварыства набыць для свайго падшэфнага сельсавету адзін трактар,—грошы ўжо ёсьць, але пакуль затрымка ў тым, што яго цяжка набыць у межах БССР.

1000 РУБ. НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

ЦП саюзу савгандальслужачых адпусьціла 1000 руб. на правядзеньне вясеньняй пасеўнай кампаніі на БССР. Саюз савгандальслужачых супольна з вытворчымі саюзамі прымае ўдзел у насыльцы на вёску рабочых брыгад. Адпушчаныя сродкі будуць, галоўным чынам, скарыстаны на рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару.

РАБОЧЫЯ-ХАРЧАВІКІ Ў ДАПАМОГУ СЯЎБЕ.

Рабочыя заводу „Беларусь" на сваім агульным сходзе пастанавілі адпрацаваць 2 гадзіны на карысьць шэфтаварыства і апрача таго пасылаюць у падшэфную вёску рабочую брыгаду з майстэрняў для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару. Рабочая брыгада выяжджае на месцы сёньня.

Завком заводу „Красная Заря" адпусьціў на правядзеньне пасеўнай кампаніі 100 руб. і таксама пасылае на вёску рабочую брыгаду з майстэрняй на два тыдні. Брыгада выяжджае ў падшэфную вёску ў бліжэйшыя дні. Не адстае і менскі хлебазавод, які дасылае рабочую брыгаду для правядзеньня сярод сялянства растлумачальнай працы аб лепшай падрыхтоўцы да сяўбы.

Калектывы групкому каапэрацыйных прадпрыёмстваў, махорачнай фабрыкі і харчтрэсту сабралі 150 руб. і дасылаюць у вёску на два тыдні сваіх прадстаўнікоў.

Выездуць рабочыя брыгады і з усіх іншых прадпрыёмстваў харчавой прамысловасьці. Завод „Беларусь", Хлебазавод і харчтрэст заведзьлі ў падшэфныя вёскі плякаты на тэму „калектывізацыя вёскі".

У заключэньне трэба адзначыць, што па ўсіх прадпрыёмствах харчавой прамысловасьці зьбіраецца попел, які перадаецца прымацаваным савецкім гаспадаркам.

Каапэратары ня зьбіраюць попелу

(Полаччына).

Мы ведаем, што ад добрага ўгнаеньня залежыць добры ўраджай, залежыць шпаркі ўздым нашай сельскай гаспадаркі, залежыць нават „рэвалюцыя" на нашых палёх. Здавалася-б, што гэта пытаньне застаецца яскравым і зразумелым.

Але іначай гэта пытаньне абстаіць у Полацкім Цэнтральным Рабочым Каапэратыве. Няма чаго казаць аб тым, што каапэрацыйныя арганізацыі як гораду, а таксама і вёскі могуць шмат чаго даць для пасьпяховага правядзеньня пасеўкампаніі, для ўзьняцьця ўраджайнасьці на нашых палёх.

На вялікі жаль, гэта не зразумелі некаторыя адказныя працаўнікі Полацкага ЦРК. Ім была дадзена яскравая, нават строгая дырэктыва аб зборы попелу, які да гэтага часу амаль што не скарыстоўваўся ЦРК. Што-ж, дырэктывы атрымалі, падшылі да справы і ўсё.

Вось вынік: да аднаго адказнага працаўніка ЦРК зьвярнуўся прадстаўнік ад Полацкага Акрэа па пытаньню аб зборы попелу, якога шмат маецца ў каапэрацыйных крамах. Каапэратар адказаў, што «собирать попел не наше дело».

Праўда, прадстаўнік акрэа імкнуўся растлумачыць бюракрату з ЦРК, але што з ім гаварыць, калі словы не дапамагаюць.

Такія выпадкі ёсьць і ў іншых арганізацыях, якія нават саромяцца зьбіраць каштоўнае ўгнаеньне. Безумоўна з гэтым зьявішчам неабходна праводзіць рашучую барацьбу, бо зборам попелу павінна цікавіцца ня толькі вёска, але павінен цікавіцца і горад, тым больш—гаспадарчыя арганізацыі.

З бюракратычнымі адносінамі да збору попелу неабходна скончыць, бо яны перашкаджаюць пасьпяховасьці правядзеньня кампаніі па падняцьню ўраджайнасьці.

С. Аляксейкаўскі.

ПОПЕЛ—НА ТРАТУАРЫ.

(Гор. Слуцак).

Падняцьце ўраджайнасьці—найгалоўнейшая задача сёньняшняга дня. Павялічэньне ўраджайнасьці залежыць ад прымяненьня шэрагу агранамічных мерапрыемстваў.

Адным з такіх мерапрыемстваў зьяўляецца збор попелу і ўгнаеньне попелам глебы.

Па Слуцку быў дадзен загад усім прадпрыемствам, установам і школам аб абавязковым зборы попелу і перадачы яго ў саведкія і калектыўныя гаспадаркі, але гэта ня ўсе выканалі.

Добрая палова ўстаноў гораду, у тым ліку і навучальныя ўстановы, большасьць вясковых школ ні аднаго хунта не сабралі попелу.

Ды як-жа добра будзе праводзіцца гэтае мерапрыемства, калі кіруючыя органы не нашчупалі цьвёрдага грунту ў сэнсе збору попелу і прымяненьня яго, як угнаеньне палёў? Возьмем як прыклад наш Гарадзкі савет. Калі ў студзені месяцы зразу закрычалі на ўсіх перакрэстках „зьбірай попел", Гарсавет, як і належыць, паставіў кадушку ў сваім памяшканьні і пачаў зьбіраць попел, даў таксама загад установам і некаторыя з іх таксама праводзілі яго ў жыцьцё.

Але-ж праходзяць два месяцы і Гарадзкі савет забыў, што пасяўная кампанія яшчэ не праведзена, павялічэньне ўраджайнасьці на 45 проц. не дасягнута і 9 сакавіка выдае абавязковую пастанову № 2, аб ачыстцы гораду і ўтрыманьні ў належн. парадку вуліц і тратуараў, дзе між іншым прапануе аб абавязковым пасьпяшаньні тратуараў пяском, або попелам кожны дзень. Такім чынам угнаеньне расьсяваецца кожны дзень па тратуарах.

Дзе-ж быў і што думаў вучастковы пракурор, калі ўзгадняліся гэтая абавязковая пастанова?

Папялеўскі.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ НАШЫРАЕЦЦА.

(Рагачэўскі р-н, Бабруйшчына).

Сацыялістычны сэктар з кожным годам расьце і шырыцца ў нашым р-не, аб чым сьведчаць лічбы. Так, арганізавана замест 12 калгасаў 14, якія аб'ядняюць 144 двары з плошчаю 1302 гэктары.

Але адным з недахопаў калектывізацыі зьяўляецца іх дробнасьць. Самы малы калгас яднае 10 сямей і самы вялікі 17. Машынных т-в вызначана арганізаваць 20, арганізавана 6; насільковых таварыств 6, арганізавана 1; малочных 2, арганізавана 3; птушкаводных 6, арганізавана 1. Такім чынам з 36 аб'яднаньняў арганізавана 11.

Усе арганізаваныя калгасы і аб'яднаньні прыступілі да практычнай працы, але ёсьць умовы, якія перашкаджаюць разгортваць яе. Такімі ўмовамі зьяўляюцца недастатковая кольксьць сэпаратараў і слабае інструктаваньне з боку агранамі.

Я. Крушына.

Трэба падцягнуцца.

Пухавіцкі райёны зямельны аддзел унёс у свой плян ачысьціць па райёну 70000 пудоў насеньня, з якога ўжо ачышчана каля 40.000 пудоў.

Сялянская насеньня ачышчана толькі 28.310 пудоў, а астатняе насеньне, гэта калгасаў і савгасаў—між тым, як меркавалася ачысьціць 70000 п. выключна сялянск. насеньня.

Райземаддзелу трэба падцягнуцца і правесьць працу ўсіх зерначысьцільных абозаў, каб апошнія ў адной вёсцы доўга не заставаліся і дарма час ня траціўся, бо пасеўная кампанія не за гарамі.

Л. Ш.

У МЕНСКАЙ АКРУЗЕ АЧЫШЧАНА 50 ПРОЦ. НАСЕНЬНЯ.

Водлуг дадатковых вестак, у Менскай акрузе ачышчана да 15-га сакавіка 50 проц. насеньня. На першым месцы стаіць Астрашыцка-Гарадзецкі райён, дзе ачышчана 119 проц.; за ім ідзе Смалявіцкі райён, дзе ачышчана 77,3 проц. На апошнім месцы—гарадзкая мяжа—14,5 проц. і Вузьдзенскі райён—19,2 проц.

„Мая хата з краю".

У лютым месяцы Белдзяржгандаль зьвярнуўся да Наркамзему:

— Мы распачалі кантрактацыю бэконных сьвіньняў, вясеньняя кантрактацыя разгортваецца ва ўсю шырыню, а таму просім паклапаціцца і своечасова забясьпечыць сябе дастатковай колькасьцю сываратки для барацьбы з эпізоотыямі сярод сьвіньняў. Справа тэрміновая і неадкладная.

Наркамзем атрымаў «тэрміновую» паперку і...паклаў яе пад сукно. Праходзіць тыдзень, адказу няма. Белдзяржгандаль настойліва паўтарае сваю прапанову.

І, урэшце, пасьля 3-х тыдняў, Наркамзем захацеў адказаць:

— Белдзяржгандаль вядзе кантрактацыю сьвіньняў, няхай ён сам і клапоціцца і аб сываратках, нам некалі займацца гэткімі дробязямі, ня наша справа, мы не павінны забясьпечыць Белдзяржгандаль сываткай...

Інакш кажучы, адказ Наркамзему можна сказаць у двох-трох словах: —«мая хата з краю, самі купляйце сываратку»...

Малайцы наркамземаўцы! На самай справе, Белдзяржгандаль кантрактуе нейкія сьвіньні, а яны павінны клапаціцца... Нічога, абыйдуцца і бяз сываткі... Ну, а калі загіне некалькі сотняў сьвіньняў, якое гэта мае значэньне, „дробязь", аб якой ня варта і гаварыць.

Бедны Наркамзем, ён скардзіцца Белдзяржгандалю: «Мы перагружаны, наш апарат працуе 24 гадзіны ў суткі, і мы нават ня маем часу, каб вам парэкамэндаваць спэцыялістаў агранамаў для правядзеньня кантрактацыі: зрабіце ласку, паклапаціцеся аб гэтым вы самі, зрабіце ласку"...

«Мая хата з краю»—вось радыяналізатарскі, гнуткі і шпаркі адказ. На самай справе, ці варта Наркамзему клапаціцца аб сываратцы, ці яго гэта справа забясьпечыць акругу вопытнымі агранамамі—у яго іншыя справы больш важныя, ці-ж варта гаварыць аб сьвіньнях?

Тры тыдні Наркамзем «красамоўна» маўчаў, наогул нічога не адказваў аб сываратцы, а толькі пры настойлівых напамінах, абудзіўся, і ледзь-ледзь адказаў:—мая хата з краю, рабіце, што хочаце, а мяне не чапайце, я і так перагружан...

Добры апарат, проста зьдзіўляючы. Неабходна выдаць асобную прэмію Наркамзему за яго ўважлівыя і сур'ёзныя адносіны да справы кантрактацыі бэконных сьвіньняў.

Л. Манін.

Павялічваем плошчу культурных траў.

(Азарыцкі райён, Мазырскай акругі).

Азарыцкі райён, на Мазыршчыне, багаты лёсавымі наносамі—пяскамі, якія ветрам могуць пераносіцца з месца на месца, пагражаючы сенажацям і пахаці, самі быўшыя няпрыгодныя да гэтага часу.

Зараз з гэтымі пяскамі азараўцы павялі рашучую барацьбу. Абсаджваюць пяшчаныя плошчы лазой, якую, на жаль, прыходзіцца з далёку прывозіць, засяваюць сэрадэлю, якая на практыцы некаторых, у тым ліку і 7-мігадавой школы ў Азарычах, лепш прывіваецца і расьце чым на нізінах.

Праўда, гэтыя мерапрыемствы яшчэ толькі пачынаюць ужывацца, але яны знайшлі належнае падтрыманьне ўсяго сялянства.

Наогул культурныя травы—лубін, сэрадэля, канюшына з кожным годам адваёўваюць сабе ўсё большае і большае месца.

Плошча пасеву лубіну, сэрадэлі і канюшыны за год павялічылася на 50 процантаў. Яна павялічыцца і ў гэтым годзе, але ў сялян адчуваецца недастача насеньня гэтых траў.

Між іншым, акрамя агранаміі, значную працу праводзіць 7-хгодка, якая на сваім паказальным вучастку засяваецца пералічаныя культурныя травы.

Вучні ў сваю чаргу пераносяць гэтыя мерапрыемствы ў гаспадаркі сваіх бацькоў.

Свой.

Ня будзе калгасу ў нас.

Магілеўшчына позьніцца з арганізацыяй новых калгасаў. Ёсьць райёны, дзе яшчэ не афармлена піводнага [illegible] або экран толькі адзін калгас.

Наглядаюцца выпадкі, калі некаторыя райёны ня толькі ня выказваюць сваёй ініцыятывы, але нават не падтрымліваюць, не дапамагаюць беднаце, дзе яна сама стыхійна цягнецца ў калгас.

Вось у вёсцы Кажамякіне шмат грамадзян жадаюць скласьці калгас, зрабілі сьпіс, адаслалі яго ў Чырвонапольскі райвыканком, просяць прыехаць, арганізаваць, зацьвердзіць статут. У райвыканкоме здаволены, што бяднякае працы з яго боку «зваліўся» калгас, абяцаюць дапамагчы. Выезд райвыканкамаўскага прадстаўніка прызначан на нядзелю... Рада беднота, з раніцы зьбіраюцца, чакаюць дарагога гасьця. Але... не дачакаліся.

А тым часам заможнікі ня сьпяць, [illegible] над беднатой, што і потым ёй [illegible] гэткая-ж увага, як зараз, страшць «агульным катлом» і інш. І некаторыя ўжо «адкідваюцца».

Другі прыклад датычыцца шэфа. Шэф паважаны—акруговая зямельная камісія. Ёй і кнігі ў руки наконт калгасаў і ўсякае калектывізацыі. І сапраўды, шэф, прыехаўшы ў самую бедную вёску падшэфнага Машанацкага сельсавету (Качурына), павёў гутарку пра калектыў. Напалі ў самую кропку, бо ўжо з восені беднота жвава абмяркоўвала пытаньне пра калгас, у якім спадзявалася палепшыць сваё гаротнае становішча. Шэфы абяцалі яшчэ прыехаць хутка з літаратураю, з кіно перасоўкаю. Але даремна іх чакае качурынская беднота (кожнае савецкае сьвята чакала!), і нарэшце, ужо можна пачуць: «Ня будзе калгасу ў нас. Няма падтрыманьня...»

К.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ.

АБ НАЗНАЧЭНЬНІ НОВАГА КАМІСАРА ЗЕМЛЯРОБСТВА БССР.

СНК унёс на зацьверджаньне прэзыдыуму ЦВК праект пастановы аб аслабаненьні т. Прышчэпава ад абавязкаў Народнага Камісара Земляробства БССР і аб назначэньні Народным Камісарам Земляробства т. Рачыцкага П. М.

НАЗНАЧЭНЬНЕ т. ПРЫШЧЭПАВА.

СНК пастанавіў назначыць т. Прышчэпава намесьнікам старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР.

КАМАНДЫРАВАНЬНЕ ЧЛЕНАЎ УРАДУ Ў МАСКВУ.

СНК пастанавіў камандыраваць у Маскву старшыню СНК т. Галадзеда, яго намесьнікаў—т. Каркліна і Карпа, Народнага Камісара Фінансаў т. Мікуліча і намесьніка Народнага Камісара Земляробства тав. Масюкова, для ўдзелу ў пасяджэньні СНК СССР, на якім будзе разглядацца пяцігадовы перспэктыўны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі.

На час адъезду ў Маскву старшыні СНК т. Галадзеда і яго намесьнікаў выканаьне абавязкаў старшыні СНК ускладзена на кіраўніка ЦСУ т. Прафорансава.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

СНК пастанавіў назначыць т. Станькоўскага, М. У. членам калегіі пры Народным Камісары Гандлю БССР.

СНК пастанавіў назначыць т. Пшанічнага В. Я. чсенам калегіі пры Народным Камісары Аховы Здароўя БССР.

СНК пастанавіў назначыць т. Пятухоўскага А. А. членам калегіі пры Народным Камісары Земляробства БССР.

СНК пастанавіў назначыць т. Стасюліча, К. М. членам калегіі пры Народным Камісары Юстыцыі БССР.

МОПР—ТЫЛ СУСЬВЕТНАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

(НА СХОДЗЕ МОПРАЎСКАГА АКТЫВУ Ў КЛЮБЕ КАРЛА МАРКСА).

24-га сакавіка ў Клюбе Карла Маркса адбылося ўрачыстае пасяджэньне ЦК МОПР'у БССР і Менскага акружовага к-тэту МОПР'у супольна з мопраўскім актывам, партыйных, савецкіх, вайсковых і грамадзкіх арганізацый, прысьвечанае 5-цігадоваму юбілею МОПР'у.

У прэзыдыум сходу былі запрошаны т. Галадзед, Славінскі, Бэйлін, Вайтэнкаў, Калмык, намесьнік старшыні выканкому МОПР'у і старшыня ЦК МОПР'у СССР т. Стасава, прадстаўнік Маскоўскага губкому МОПР'у т. Масман, адказаны сэкратар Бранскага губкому МОПР'у т. Назараў і інш.

З вялікім дакладам аб працы і задачах МОПР'у выступіла т. Стасава.

Тав. Стасава абмалявала жудасную карціну белага тэрору ў краінах капіталу. Толькі ў працягу аднаго 1928 г. прыслужнікі капіталу забілі 146.520 рабочых, паранёна—67.000, арыштавана 117.238. Працэсаў было наладжана 1951. Асуджана ў турмы—30377, пакарана сьмерцю 23266, асуджана на ўсё жыцьцё ў катаргу—42.

Тав. Стасава зварачвае ўвагу на рост фашысцкіх арганізацый ва ўсіх капіталістычных краінах, якія рыхтуюцца да вайны, бо фашысты ўсімі спосабамі дапамагаюць сваім урадам весьці барацьбу з рэвалюцыйным рухам. Але і рэвалюцыйныя кадры ня дрэмлюць. З кожным годам растуць і мацнеюць шэрагі Мопр'у, з кожным годам узрастае іх барацьба з рэакцыяй з тэрорам. Лепшыя прадстаўнікі рабочае клясы і сялянства напаўняюць шэрагі Мопр'у.

— Яшчэ да гэтага часу, гаворыць далей т. Стасава,—у нас ёсьць шмат ячэек, якія існуюць толькі на паперы, мы ня досыць актыўна разгортваем мопраўскую работу сярод сезоннікаў, сярод сялянства. Асабліва мала ўцягнута ў арганізацыю Мопр'у сялянства. На гэту справу трэба зараз зьвярнуць пільную ўвагу, трэба паставіць працу так, каб спыніць цякучасьць складу мопраўскіх арганізацый, трэба сур'ёзна ўзяцца за апрацоўку тэм, каб кожны член мопраўскай арганізацыі дэталёва прапрацаваў задачы Мопр'у, каб моцна ўцягнуць яго ў штодзённую працу.

Задачы Мопр'у трэба зьвязаць з задачамі нашага агульнага сацыялістычнага будаўніцтва. Усе кампаніі, якія праводзяцца ў нас, павінны зьвязвацца з задачамі Мопр'у. Адначасна з гэтым мы павінны зьвярнуць вялікую ўвагу на інтэрнацыянальнае выхаваньне членаў Мопр'у.

— Я лічу,—кажа ў сваім выступленьні ад ЦСПСБ тав. Вайтэнкаў,—што саюзныя арганізацыі павінны больш рашуча ўзяцца за ўцягненьне сваіх членаў у шэрагі Мопр'у. Саюзныя масы павінны чула адгукнуцца на ўсе кампаніі дапамогі палітвязьням капіталістычных астрогаў. Фашысцкай зграі ў капіталістычных краінах мы павінны супроцьпаставіць моцную мопраўскую арганізацыю.

Прадстаўнік Маскоўскай арганізацыі Мопр'у т. Масман заклікае ўсіх працоўных вясьці барацьбу з нашым унутраным фашызмам: антысэмітызмам і трацкісцкімі ўхіламі. Трэба рашуча паставіць пытаньне аб узмацненьні інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Апроч гэтага, з прывітаньнямі выступалі т. т.—Лакцієнаў, Васілевіч, ад Бранскай арганізацыі тав. Назараў і інш.

* * *

Вялікае ўражаньне на сход зрабілі падарункі рознымі рэчамі і грашыма. Усяго было паднесена звыш 3000 руб. Ячэйка інвалідаў паднесла звыш 500 руб., краўцы—400 руб. рабочыя г. Барысаву—1000 руб. сяляне Пухавіцкага району—147 руб. і г. д.

ЦК Мопр'у БССР пры ўрачыстых абставінах паднёс т. Стасавай чэк на 18.500 руб. для перадачы Выканкому Мопр'у

* * *

Сход атрымаў прывітальную тэлеграму ад ЦК Мопр'у Заходняй Беларусі, якая была зачытана пад гучныя воплескі ўдзельнікаў сходу. Ад імя ЦК Мопр'у БССР, сход зьвярнуўся з лістом-адозвай да працоўных усяго сьвету з заклікам узмацняць шэрагі Мопр'у.

Аднагалосна пастаноўлена паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦК ВП(б)Б і Выканкому Мопр'у.

* * *

13 лепшым ячэйкам Мопр'у былі выданы дыпломы і жэтоны. Атрымалі нагароды ячэйкі: Дзяржгандлю, рабфаку, ДПУ, заводу „Энергія", «Домбаль», «Камінтэрн» (апошнія дзьве з г. Барысава) і шчотачнікаў.

ПАЛЕПШЫЛІ ДАБРАБЫТ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.

(№-скі Чырвонаштандартны полк).

Аб агляде чырвоных казармаў было растлумачана чырвонаармейцам у часе па-за школьнай працы і на сходах парт'ячэек, груп ЛКСМ супольна з беспартыйнымі чырвонаармейцамі. Па гэтаму пытаньню было дадзена звыш 200 прапаноў з боку чырвонаармейцаў. Гэтыя прапановы разглядаліся на пасяджэньні камісіі па агляду і больш паловы праведзена ў жыцьцё. Разам з гэтым у кожным падразьдзяленьні былі ўтвораны групы чырвонаармейцаў з удзелам камандзнага складу па агляду. Сродкі на агляд казармы сабраны ў суме 5.228 р. 65 к., якія сабраны ад гаспадарчай часткі, сатаварыскіх арганізацый і ад наладжаных супольна вяндзьніцкаў.

За гэтыя сродкі абсталяваны казармы, сталоўкі, ленкуткі і астатнія памяшканьні, для якіх куплена 192 вонскіх крэсла, па 5 новых сталоў і па 4 шахматныя столікі. Усе чырвонаармейцы забясьпечаны зубнымі шчоткамі і парашком, шчоткамі для адзеньня і ботаў, голкамі і ніткамі. Радыёфікаваны 2 ленкуткі і чырвонаармейская чайная, спраўлены ўсе музычныя інструменты, таксама бывае таннае кіно для чырвонаармейцаў. Я. Лашкевіч.

ТРОЦКІ НА ТРЫБУНЕ ЧЭМБЭРЛЕНА*).

Калі «левы камуніст» Троцкі апынуўся на тэрыторыі капіталістычнае дзяржавы, ён пачаў не са згрупаваньня сваіх «левых», не з апэляцыі да пралетарыяту супроць правых элементаў кампартыі, а з апэляцыі да буржуазеі супроць савецкай улады. Пасьля зьяўленьня ў Канстантынопалі яго першым крокам была заява на імя «Яго прэвасхадзіцельства пана прэзыдэнта Турэцкае рэспублікі Кемаля-Пашы»: «У ворот Константинополя я имею честь сообщить Вам, что ко по своему свободному выбору я прибыл на турецкую границу и что я перехожу эту границу, лишь уступая насилию. Благоволите, г-н президент, принять мои почтительные чувства». Другім крокам яго было выяўленьне сэрыі артыкулаў у рэакцыйнай буржуазнай прэсе, у органе Чэмбэрлена „Дэйлі Экспрэс", у органе амэрыканскіх капіталістаў «Нью-Ёрк Таймс» і ў іншых гэткіх газэтах—артыкулаў, у якіх Троцкі апавядае чытачам гэтай рэакцыйнай прэсы, як яго высылалі з СССР і як яго крыўдзіла «перерожденное чиновничество» савецкае ўлады.

Калі Троцкага высылалі з СССР, партыйныя і беспартыйныя рабочыя Савецкае Рэспублікі віталі савецкі ўрад. Калі Троцкі пераехаў праз граніцу, капіталістычныя і сацыял-дэмакратычныя газэты наперабой віталі яго, Троцкага. З поваду высылкі Троцкага выраўняліся адзін супроць другога два фронты: пралетарыят і савецкая ўлада, з аднаго боку, капіталістычная і сацыял-дэмакратычная прэса і Троцкі—з другога боку. Горш пакараць Троцкага, як даць яму поўную волю самавыкрываньня, цяжка было. Калі Троцкі зьявіўся перад замежным сьветам, яго сапраўдная менавая вартасьць адразу была выяўлена на біржы.

Калі Троцкі быў яшчэ рэвалюцыянэрам і сталў у шэрагах бальшавіцкае партыі, ён пісаў у 1920 годзе: «Мы ваюем. Мы змагаемся не на жыцьцё, а на сьмерць. Друк ёсьць спосаб двух незамірымых, узброеных і змагаючыхся лягераў. Мы руйнуем друк контррэвалюцыі таксама, як руйнуем яе ўмацаваныя пазіцыі, яе склады, яе камунікацыі, яе разьведкі. Мы пазбаўляем сябе кадэцка-меншавіцкіх выяўленьняў коррупцыі рабочае клясы? Затое мы пераможна руйнуем асновы капіталістычнае коррупцыі». (Л. Троцкі. «Тэрарызм і камунізм»).

Зараз, калі Троцкі вызваліўся ад кантролю бальшавіцкае партыі, калі ён апынуўся «на волі», ён сьпяшаецца скарыстацца гэтым самым друкам контррэвалюцыі для «выяўленьня коррупцыі» савецкае ўлады. На старонках чэмбэрленаўскага органу ён дае вытрымкі свайго ліста ў прэзыдыум Камінтэрну, у якім ён у адказ на патрабаваньне спыніць сваю „палітычную (г. зн. антысавецкую. А. М.) дзейнасьць", гаворыць: «Калі вы рашылі і надалей шляхам гвалту кіраваць абураным народам, дык мы можам і да канца будзем выконваць свой абавязак". Такім чынам, Троцкі на старонках моцна-рэакцыйнае чэмбэрленаўскае прэсы ўзводзіць паклёпы на Савецкую Рэспубліку, паказваючы справу так, нібы ў ёй народныя масы абураюцца супроць пануючага рэжыму гвалту. Чэмбэрлен можа зараз Троцкаму паціснуць руку: мы з вамі, містэр, у найбольш злабадзённым пытаньні аднадумцы, хоць спосаб выказацца ў нас розны.

Калі Троцкі стаяў яшчэ ў шэрагах Камінтэрну, ён у сваім дакладзе на IV кангрэсе Камінтэрну, выступаючы супроць апартуністычных элементаў французкае кампартыі, супрацоўнічаўшых у буржуазнай прэсе, гаварыў у абарону рэвалюцыі Выканкому аб кантролі над друкам: „Трэба раз назаўсёды скончыць з уяўленьнем аб друку, як аб спосабе для практыкаваньня талэнту журналістаў. Вельмі добра, калі той ці іншы журналіст уладае талентам, але друк зьяўляецца нічым іншым, як спосабам барацьбы... Возьмем гэтыя рэвалюцыі (Выканкому Камінтэрну): якая з іх пагражала партыі?Можа быць, рэвалюцыя аб кантролі над друкам, ухваленая адносна Фабра і Брызона, якія прыкрываліся аўтарытэтам членаў партыі для таго, каб майстраваць чыста-асабістыя справы, кампрамэтуючыя партыю? Хіба-ж не пара было спыніць гэты спосаб супрацоўніцтва ў буржуазных газэтах, атручваючых народныя масы?..» (Гл. IV Сусьветны Кангрэс Камінтэрну, Стар. 334, 349). Зараз, калі Троцкі апынуўся па-за шэрагамі Камінтэрну і вызваліўся ад яго няпрыемнага кантролю, ён сам «майструе свае чыста асабістыя справы», друкуючы за поўнаважныя даляры артыкулы ў буржуазных газэтах, «атручваючых народныя масы», і пры гэтым не ў буржуазна-дэмакратычных масонскіх газэтах, як некалі Фабр і Брызон, а ў моцна-рэакцыйных. І ў гэтых артыкулах—«Аб маей высылцы»—ён становіцца ў позу перад буржуазнай аўдыторыяй, паказваючы, як ён, гэты „скаваны Праметэй", у Алма-Аце «хацеў», але не пасьпеў паляваць на тыграў, як «далёкія радыёстанцыі праз хвалі эфіру пасылалі запытаньні», дзе знаходзіцца Троцкі, у той час, як ён прымушан быў забаўляцца гульнёй у шахматы з сынам, як «свае сабакі»—пойнтэры Троцкага былі занепакоены, убачыўшы столькі «чужых» людзей—працаўнікоў ДПУ і г. д.

Прыяцелі і аднадумцы Троцкага ў «Фане дэс Камунізмус» пішуць, што „высылка Троцкага роўназначна пакараньню сьмерцю Робэспіера і 9-му тэрмідору". А сам «пакараны Робэспіер», містэр Троцкі, пасьля таго, як ён гуляў у шахматы ў Алма-Аце і зьбіраўся на паляваньне там на тыграў, спакойна піша зараз фэльетоны і рэклямуе сябе ў жоўтым буржуазным друку, пад воплескі ўсіх сацыял-дэмакратычных лёкаяў буржуазеі, заяўляючых наперабой: ты цяпер наш, ты цяпер наш Троцкі, хоць і не адважваешся яшчэ гэта прызнаць! Які сумны трагічны канец адшчапенца ад бальшавіцкае партыі!

* * *

Як гэта магло здарыцца? Быў-жа час, калі імя Троцкага на ўсіх мовах скланялася разам з імем Леніна. Так, гэткі час быў. Але ў той час цэлая прорва аддзяляла характар гэтых двух людзей. Досыць зазначыць га адну маленькую рыску, у якой, як у кроплі вады, адбівалася гэта прорва. Ленін заўсёды гаварыў—„мы": „мы" гэтак апэнвалі сітуацыю, „мы" высоўвалі такі-та лёзунг, «мы» намячалі такую-та стратэгічную лінію. Ленін увесь свой геніяльны розум, усю сваю нястрымную энэргію, увесь свой рэвалюцыйны энтузіязм бяз рэштткаў перачаканьваў у капітал для сваёй партыі., для рэвалюцыйнага авангарду рабочае клясы. Троцкі гаварыў заўсёды «я», Для яго партыя служыла толькі падстаўкаю, на якой узвышалася яго самазакаханае «я». Ленін быў вялікі пралетарскі правадыр, Троцкі быў самазакаханы дробнабуржуазны рэвалюцыянэр, часовы спадарожнік пралетарыяту.

Троцкі ніколі не займаўся «арганізацыяй пралетарскае партыі". Ён уздымаўся ўверх на рэвалюцыйнай хвалі і падаў разам з гэтай хвалай, сьпяшаючыся вызваліцца ад партыйных пут («казарменная дысцыпліна»), «зазоліўшы сваё дробнае самалюбства першым днём бліжэйшай рэвалюцыі». Так было ў 1905 годзе, калі ён, стаўшы на адзін момант на чале Пецярбургскага Савету Рабочых Дэпутатаў, пасьля паражэньня рэвалюцыі скапіўся ў балота ліквідатарства. Так было і ў эпоху Кастрычнікавай рэвалюцыі, калі ён стаўшы на чале Чырвонай арміі ў часе грамадзянскай вайны, вельмі хутка пагас і пачаў чадзіць, калі бліскучы пэрыяд грамадзянскай вайны, які даў яму лаўры, зьмяніўся пазбаўленым усякіх эфэктаў нэцам, калі мільёны бязыменных гэроў пралетарыяту у барацьбе з голадам і разрухаю пачалі будаваць сацыялізм, адбудоўваючы па цаглінцы зруйнаваную вытворчасьць.

Пачынаючы з 1923 году, з так званага «крызісу ножніц», Троцкі ня спыняў каркаць аб непасрэдна пагражаючай «пагібелі рэвалюцыі». І надзвычайна характэрна для Троцкага было, што перманентны бунт супроць партыі ў яго пачаўся не з апэляцыі да пралетарыяту супроць нібы «немажлівага партыйнага рэжыму», а з апэляцыі да „вучнёўскай моладзі", у той час яшчэ ў значнай большасьці мяшчаска-інтэлігенцкай па свайму складу.

* * *

Фрыдрых Энгельс у сваёй прадмове да „Разьвіцьця сацыялізму ад утопіі ў навуцы" вызначыў як «адзін з законаў разьвіцьця буржуазнае грамады" тое, што рэвалюцыю трэба давесьці значна далей як непасрэдных, бліжэйшых, дасьпеўшых ужо зусім буржуазных мэтаў для таго, каб сапраўды ажыцьцявіць гэтыя мэты, каб бесзваротна замацаваць мінімальныя буржуазныя заваёвы (гл. Ленін. Збор твор., т. XI, ч. 1. „К оценке русской революцыі"). Кажучы іншымі словамі, „адзін з законаў буржуазнае грамады" гаворыць, што кожная вялікая буржуазная рэвалюцыя непасрэдна заканчваецца контр-рэвалюцыяй, якая адымае частку рэвалюцыйных заваёў. Кастрычнікавая рэвалюцыя гэтаму закону зьмены рэвалюцыі контр-рэвалюцыяй не падпарадкавалася, але іменна таму, што яна была не буржуазнай, а пралетарскай рэвалюцыяй, іменна таму, што яна ня толькі вышла з гістарычна-абмежаваных рамак буржуазнае рэвалюцыі, але і ўстанавіла дыктатуру пралетарыяту, стварыўшы, такім чынам, мо

НА ФРОНЦЕ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Асьветнікі—на сельска-гасп. фронт!

Напружанае становішча в сельска-гаспадарчымі прадуктамі ў краіне паставіла перад партыяй і органамі савецкай улады актуальную задачу ўзмацненьня тэмпу падняцьця сельскай гаспадаркі наогул і значнага павялічэньня сельска-гаспадарчай прадукцыі ў бягучым гаспадарчым годзе—ў прыватнасьці.

На пытаньню падняцьця ўраджайнасьці мы маем шэраг надзвычайна важных законаў, якія выдадзены як саюзным урадам, так і ўрадам БССР і якія стымулююць рост сельска-гаспадарчай прадукцыі. Утварэньне буйных савгасаў, рост калектываў, павялічэньне кредытаў, прасоўваньне сельска-гаспадарчых машын—усё гэта павінна даць належны эфэкт у падняцьці сельскай гаспадаркі.

Аднак, трэба памятаць, што ў нас асноваю пакуль што—гэта бяднякі-серадняцкія гаспадаркі, якія зьяўляюцца галоўнымі пастаўшчыкамі на рынак сельска-гаспадарчых прадуктаў. Весь чаму партыяй і ўрадам прыняты шэраг мер, каб зацікавіць беднякa і серадняка селяніна падняцьцем свае гаспадаркі.

З гэтага пункту погляду выдадзены і новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку. Захоўваючы прынцып клясавых інтарэсаў, прагрэсыю і індывідуальнае абкладаньне, новы закон дае шэраг ільгот бяднякам і серадняцкім гаспадаркам якія ўводяць тыя ці іншыя агрыкультурныя палепшаньні.

У сучасны момант на ўсёй БССР праводзіцца вялікая праца па падрыхтоўцы да весьненьняй сяўбы. Вялізарнейшы стымул для пашырэньня плошчы пасеву, увядзеньня агрыкультурных элемэнтаў і падняцьце ўраджайнасьці мае новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку. Трэба каб кожная вёска, кожны селянін ведалі аб тых ільготах, якія даюцца бяднякам-серадняцкім гаспадаркам новым законам аб сельска-гаспадарчым падатку.

Неабходна шырока сярод сялянскіх мас папулярызаваць закон. Неабходна тлумачэньне новага закону зьвязаць з абмеркаваньнем і ажыцьцяўленьнем практычных мерапрыёмстваў, накіраваных на палепшаньне стану сельскай гаспадаркі, на пашырэньне плошчы пасеву, на ажыцьцяўленьне агрыкультурнага мінімуму.

Папулярызацыяй сельска-гаспадарчага падатку павінны заняцца ўсе органы савецкай улады, усе арганізацыі, якія маюць хоць самую малую сувязь з вёскаю, з сялянствам.

У справе папулярызацыі, растлумачэньня сялянству новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку надзвычайна вялікую ролю могуць адыграць **культ - асьветныя ўстановы на вёсцы, настаўніцтва, хатнікі—наогул культурныя працаўнікі.**

Кожная школа, хата-чытальня, бібліятэка, нардом павінны паставіць перад сабою задачу папулярызацыі падатку. Дзеля гэтай мэты патрэбна скарыстаць агульныя сходы сялянства з пастаноўкаю спэцыяльных дакладаў аб с-г. падатку, наладзіць гутаркі з сялянствам у хатах-чытальнях, скарыстаць сельска-гаспадарчыя гурткі, дабіцца пастаноўкі пытаньня аб растлумачэньні с-г. падатку на пленумах сельсаветаў, КСУ і г. д.

Настаўніцтва, хатнікі, ліквідатары няпісьменнасьці могуць і павінны растлумачыць сялянству новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку.

М.

Паход за ўраджай—лепшы від грамадзка-карыснай працы.

У масавым культурным паходзе моладзі, які праводзіцца па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам камсамолу, адна з частак яго—паход за ўраджай—павінна заняць усю ўвагу рабоча-сялянскае моладзі нашае крыны.

Між тым частка гэтае моладзі, якая, здавалася-б, павінна ўзяць на сябе вырашэньне найбольш складаных задач—студэнты тэхнікумаў,—да апошняга часу недастаткова ўцягнута ў грамадзкую працу па падняцьцю ўраджайнасьці, у паход за ўраджай. У гэтай справе неабходна перамагчы перашкоды, каб сканцэнтраваць усю ўвагу на пытаньнях аграпрапаганды і практычнае дапамогі калгасам і бядняцка-серадняцкім гаспадаркам вёскі. Дзеля гэтага давядзецца сьвядома пайсьці на шэўныя ахвяры, правесьці дадаткова частковае пераключэньне энэргіі і ўвагі з аб'ектаў акадэмічнай працы на аб'екты грамадзка-карыснай дзейнасьці.

Гэта праца павінна быць тым грамадзка-палітычным экзаменам, які павінен вытрымаць кожны тэхнікум, у цэлым, як установа, кожны працаўнік і студэнт тэхнікуму паасобку.

Ужо падыходзіць час пачатку весняное сяўбы. Неабходна як мага шырэй разгарнуць працу зараз-жа, каб той час, які застаўся да сяўбы, і ў часе сяўбы цалкам выкарыстаць дзеля дапамогі ў практычным вырашэньні задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у справе падняцьця ўраджайнасьці і перабудовы сельскай гаспадаркі.

З вопыту разгортваньня тэхнікумамі працы на правядзеньню пасяўное кампаніі і падняцьцю ўраджайнасьці (на прыкладзе працы Чырвона-Бярэскага аграпэдтэхнікуму) вынікае неабходнасьць большае канкрэтызацыі яе, пераводу ўсіх мерапрыёмстваў на практычныя рэйкі. Побач з досыць плянавым і пасьпяховым разгортваньнем аграпрапаганды праз асобныя 2-хтыднёвыя с-г. курсы на вёсках, праз вячорнія школы сялянскае моладзі і чырвоныя куткі, што абслугоўваюцца студэнцтвам, шляхам гутарак на сялянскіх сходах такія пытаньні, як зьбіраньне попелу, ачыстка насеньня, займалі аднак недастаткоўую ўвагу, праводзяцца ў значнай большасьці бяз удзелу прымацованых для працы ў дадзенай вёсцы студэнтаў. Патрэбна перанесьці гэту працу ў сялянскі двор, паглядзець, што і як робіцца селянінам у гэтым напрамку, даць канкрэтныя тлумачэньні і парады па месцы, дакладна падлічыць тое, што прароблена.

У найбліжэйшы час неабходна падрыхтаваць усе патрэбныя зьвесткі, зарэгістраваць аб'екты, разьмеркаваць сілы і правесьці шэраг практычна-паказальных работ. Прыкладна, неабходна правесьці наступнае:

1) Вызначыць кожнаму студэнту групу двароў у вёсцы, пасёлак ці калгас дзеля пастаяннае жывое сувязі па ўсіх пытаньнях агульнага парадку, як ачыстка і пратручваньне насеньня, збор і скарыстаньне попелу, набыцьцё і ўжываньне мінэральных угнаеньняў, засеў лубіну і інш.

2) Зарэгістраваць сады, патрабуючыя палепшаньня, і даручыць падасабовую адказнасьць кансультацыю і нагляд, або і непасрэднае выкананьне асабліва ў дробных садох такіх работ, як апырэкваньне, абрэзка дрэў, акопка, угнаеньне і інш.

3) Вызначыць пункты і асоб дзеля правільнае арганізацыі, апрацоўкі, засеву і догляду гародаў.

4) Вызначыць месцы, падрыхтаваць і правесьці закладку вопытна-паказальных дзялянак, пашырыўшых сетку іх параўнаўча з мінулым годам.

Разам з гэтымі бягучымі практычнымі задачамі, неабходна падрыхтаваць глебу, правесьці арганізацыйную працу, часткова, з дапамогаю аграномаў, і тэхнічную працу па арганізацыі калектыўных гаспадарак, шматпалёвых севазваротаў, тых ці іншых, гледзячы па ўмовах, таварыстваў, вытворчаму каапэраваньню сялянства і г. д. Гэтыя віды працы таксама павінны быць разьмеркаваны пад персанальную адказнасьць.

Уся праца ў справе практычнае дапамогі павінна быць накіравана на падняцьце калектыўных гаспадарак і гаспадарак сялян беднякоў і незаможных сераднякоў.

І гэта праца будзе сапраўды грамадзка-карыснаю.

Пакуль яшчэ ня позна, студэнцтву тэхнікумаў (і ў пэўных формах—вучням школ II канцэнтру і інш.), перамагаючы і адлегласьць і брак часу, неабходна шчыра ўзяцца за працу і вытрымаць сацыяльны экзамен. **Зянюк.**

Чырвоны Бераг.

У барысаўскіх правапарушыцеляў.

Нядаўна ў г. Барысаве адчынен рэфарматорыум дзеля паравыхаваньня непаўналетніх правапарушыцеляў ва ўзросьце ад 14 да 18 гадоў, на якіх распаўсюджваецца напраўча-працоўны Кодэкс. Паравыхаваўчыя мэты ажыцьцяўляюцца праз арганізацыю школы ў абхваце 1-га канцэнтру, праз арганізацыю вучэбна-вытворчых майстэрняў і ўстанаўленьне такога вучэбна-выхаваўчага і працоўнага рэжыму ўстановы, пры дапамозе якога можна прышчапіць выхаванцам неабходныя сацыяльна-культурныя і карысныя звычкі, пашырыць круг іх ведаў і навучыць іх кваліфікаванаму рамяству.

Гэта—першая ва Беларусі ўстанова, якая ставіць выхаванцаў ва ўмовы ізаляцыі. На НКУС ляжыць вельмі адказная і цяжкая задача—выпрацаваць для гэтай установы статут і вучэбна-выхаваўчую сыстэму. Першыя крокі дзейнасьці рэфарматорыуму даюць нам упэўненасьць у тым, што ў справе яго арганізацыі ўзят правільны курс, што паступова ўтвараюцца найлепшыя ўмовы для паравыхаваньня і прыстасаваньня да самастойнай працы дзяцей сацыяльна запсаваных, псыхічна неўраўнаважаных.

У сучасны момант рэфарматорыум знаходзіцца ў стадыі арганізацыі. Выхаванцы пачалі паступаць толькі з 1-XII 1928 г. І ня гледзячы на такі кароткі час, ня гледзячы на недахоп педагогаў (толькі 3 на 90 дзяцей), ужо ёсьць значныя дасягненьні: ёсьць дзіцячае самакіраўніцтва, выпушчаны 3 нумары насьценгазэты, адбылося тры вечары са спэктаклямі, рэгулярна выдуцца клясныя і клюбныя заняткі, наладжана моцная сувязь з піянэрамі і гарадзкімі школамі.

Пры наведваньні гарадзкога кіно і клюбаў выхаванцы зьвяўляюць грамадзян стройнасьцю сваіх шэрагаў, дысцыплінаванасьцю, вытрыманасьцю.

Узяты рашучы напрамак на васнізацыю ўстановы, на грунце чаго будзе выхоўвацца дысцыплінаванасьць.

Майстэрні будуюцца па сыстэме курсаў ЦІПУ, што таксама зьяўляецца найлепшым сродкам дзеля выпрацоўкі дысцыплінаванасьці і калектыўнасьці. А паведваньне майстэрняў абавязкова для ўсіх выхаванцаў. Па скончэньні курсаў кожны выхаванец пройдзе экспэртызу і атрымае належны рамясьніцкі дыплём.

Люба глядзець, як учарайшыя „анархістыя" і „бандыты" самі будуюць сваю ўстанову, яе парадак і дысцыпліну.

Хутка некаторыя выхаванцы будуць накіраваны на прадпрыёмствы. Шкода, што няма сродкаў на арганізацыю новых цэхаў, каб абхапіць вытворчасьцю выхаванцаў на 100 проц., але трэба спадзявацца, што Цэнтральная Дзіцячая Камісія, якая фінансава дапамагла рэфарматорыуму стаць на ногі, дапаможа закончыць яго будаўніцтва.

Праежджы

Сувязь са скончыўшымі Беларускую Дзяржаўную С.-Г. Акадэмію.

Пытаньні культурнай рэвалюцыі, пытаньні агульнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на новай вытворчай базе набываюць у сучасны момант выключнае значэньне. Разьвязваньню гэтай задачы павінны аддаць усе свае сілы перш за ўсё аграномы, скончышыя с.-г. тэхнікумы і с.-г. ВНУ.

Але гэта настаўленая жыцьцём праблема вэстольні складаная і цяжкая, што дзеля больш удачнага разьвязваньня яе працоўчым на месцах аграномам неабходна трымаць самую цесную сувязь з навуковымі краўнікамі ВНУ. Неабходна, каб месцовыя аграномы мелі магчымасьць своечасова давядзецца аб усіх тых навейшых дасягненьнях навукі, якія патрэбны дзеля разьвязкі практычных пытаньняў, і хоць бы часткова скарыстаць указаньні прафэсуры ў асобных канкрэтных выпадках. У сваю чаргу дзеля занятых падрыхтоўкай новых кадраў аграномічных працаўнікоў—навуковых дасягнэнняў неабходна чутка прыслухацца да запатрабаваньняў жыцьця, каб давець свае выхаванцам на магчымасьці тыя веды і навыкі, якія патрабуюцца ад агранома ў яго практычнай дзейнасьці.

Дзеля гэтага неабходна ўстанавіць самую цесную сувязь і ўвязку паміж тэорыяй і практыкай, паміж практычнымі навуковымі працаўнікамі—праз перапіску, перыядычныя весьці і г. д.

Вось гэту задачу ўстакаўленьня цеснай увязкі ў працы практычных і навуковых працаўнікоў паміж сабой ставіць перад сабой в'арганізаванае пры Бел. С.-Г. Акадэміі «Бюро сувязі са скончышымі В.Д.С.-Г.А».

Па налажэньню аскаўнымі задачамі бюро зьяўляецца:

1) прыцягненьне шырокіх колаў спэцыялістых да навейшых дасягненьняў, якія ёсьць у навуч. установе, і папулярызацыі навукова-тэхнічных ведаў на галіне адпаведнай асьветы нав. установы;

2) умацненьне сувязі паміж тэорыяй і практыкай праз азнаямленьне і апрацоўку асобных пытаньняў адпаведнай навуч. установы ў галінах, якія ко знаходзяць сабе вырашэньня ў практыцы;

3) высьвятленьне тых недахокаў, з якімі сустракаюцца нашы спэцыялісты ў штодзённай працы пры дапасаваньні набытых тэаретычных ведаў з умовамі практыкі;

4) зьбіраньне заўваг скончышых адносна тых ці іншых праблем у настаноўцы вучэбнае справы навучальнае ўстановы;

5) вывучэньне пытаньня аб кваліфікацыі скончышых ВНУ і тэхнікумы аб прыстасаваньні іх да грамадзкае працы на месцах;

6) на падставе гэтых канкрэтных фактаў Бюро сувязі сумесна з акадэмічнымі органамі распрацоўвае мерапрыёмствы да зьнішчэньня недахопаў у арганізацыйнай галіне далейшай нав. установы.

Даводзячы да ведама ўсіх скончышых Б.Д.С.-Г.Акадэмію, Бюро сувязі прапануе ім увайсьці з ім у непасрэдную перапіску на шэрагу тых момантаў, якія закрануты вышэй.

Было б вельмі пажадана, каб скончышыя са свайго боку высунулі шэраг пытаньняў і праблем дзеля разьвязкі ак непасрэдна працаўнікамі акадэміі, гэтак і агульнымі сіламі ўдзельнікаў зьезду скончышых, які мяркуецца склікаць.

Усю карэспандэнцыю накіроўваць па адрасу: гор. Горкі, Аршанскае округі, С.-Г. Акадэміі, дэканат аграфаку. «Бюро сувязі са скончышымі".

Бюро сувязі.

Зьнішчым няпісьменнасьць.

Полаччына—прыклад для іншых акругаў.

МЕСЯЧНІК «ЗА ГРАМОТУ» ПАСЛУЖЫЎ СЫГНАЛАМ.

Да сёлетняга навучальнага году, асабліва да пачатку месячніка «За грамату», справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці на Полаччыне кульгала.

На працягу месячніка арганізавана 75 новых ячэек „Прэч Няпісьменнасьць", з лікам 2384 сябры, у выніку чаго арганізацыя павялічылася да 133 яч. з 3682 сябрамі. Гарадзкая арганізацыя павялічылася з 1 яч., з 53 чал., да 11 ячэек, з 603 сябрамі.

Па акрузе было адчынена шмат новых лікпунктаў, якімі ахоплена каля 9625 няпісьменных і малапісьменных. Школ малапісьменных было адчынена 42 з 980 вучнямі. Сабрана 5350 р. сродкаў.

У большасьці райёнаў былі праведзены тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў, якімі было ахоплена больш 150 чал. Гэтыя курсы абслугоўвалі вясковае настаўніцтва.

Асабліва прыходзіцца адзначыць вялікую працу полацкага пэдтэхнікуму. Калектыў настаўнікаў пэдтэхнікуму прыняў на сябе агульнае мэтадычнае кіраваньне працай па ліквідацыі няпісьменнасьці ў горадзе. Студэнцкія арганізацыі высунулі для правядзеньня працы па зьнішчэньню няпісьменнасьці 110 курсантаў 3-х старэйшых курсаў, цалкам прыняўшы на сябе абслугоўваньне найбольш моцнага саюзу—будаўнікоў, на якіх няпісьменнасьць зьнішчаецца на ўсе 100 проц.

Не адставалі ад пэдтэхнікуму і студэнты лесатэхнікуму, якія праз выезды па вёсках арганізавалі некалькі лікпунктаў і наогул правялі вялікую працу сярод сялянства.

НАВУЧЫМ 12 ТЫСЯЧ НЯПІСЬМЕННЫХ.

Зараз па **Полацкім райёне** налічваецца 94 лікпункты, 10 школ для малапісьменных, з лікам 2090 дарослых вучняў. У **Ветрынскім райёне** працуе 112 лікпунктаў па зьнішчэньню няпісьменнасьці, 5 школ для малапісьменных, якія налічваюць больш 1880 дарослых вучняў. Па **Расонскім райёне** налічваецца 85 лікпунктаў, 5 школ малапісьменных, дзе вучыцца 1240 чалавек. Па **Асьвейскім райёне** налічваецца 44 лікпункты, **Вальнецкім**—44, **Вушацкім**—56, **Дрысенскім**—45 і па **Лепельскім райёне** налічваецца 40 лікпунктаў; усе яны ахапяюць каля 6013 чалавек.

Па акрузе працуе 153 ячэйкі «Прэч Няпісьменнасьць», па гораду—13 ячэек. У горадзе працуе 25 лікпунктаў, дзе займаецца больш 700 рабочых, служачых і іх жонак. Каапэрацыйныя арганізацыі ўзялі на сябе абслугоўваньне лікпунктаў кнігамі, падручнікамі і рознымі прыладамі, якія неабходны для вучняў.

Апрача гэтага асьветнікі Полацку адчынілі пры мясцовай №-скай чырвонаармейскай дывізіі чырвонаармейскі універсытэт, куды высунуто 20 настаўнікаў з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй для выкладаньня.

КАМСАМОЛЬЦЫ ЎПАРТЫЯ ВОРАГІ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ.

Перад пачаткам навучальнага году кожны райком камсамолу мабілізаваў па 30-40 камсамольцаў, якія скончылі райённыя курсы ліквідатараў.

Камсамольцы адчынілі некалькі дзесяткаў лікпунктаў, ячэек «Прэч Няпісьменнасьць», а для сталай працы высунулі са сваіх шэрагаў спэцыяльных ліквідатараў.

Мы мелі і маем добрыя прыклады: у мінулым годзе камсамолец **Караткевіч**, з Нацкага сельсавету, Ветрынскага райёну навучыў 75 чал. няпісьменных, за што тав. Караткевіч атрымаў шчырую падзяку ад мясцовага насельніцтва.

Камсамолка **Сівалобава** (в. Рагачы, Рудзянскага сельсавету) у мінулым годзе навучыла пісьменнасьці 12 сялянскіх дзяўчат, а ў гэтым годзе адчыніла лікпункт, дзе займаецца больш 40 няпісьменных і малапісьменных.

ПРАВОДЗІМ КОНКУРС—АДЗНАЧАЕМ ЛЕПШЫХ.

Полацкі акруговы інспэктарыят асьветы, акрсавет „Прэч Няпісьменнасьць", разам з рэдакцыяй «Чырвонай Полаччыны», з 15 лютага 1929 г. праводзіць на старонках «Чырвонай Полаччыны» конкурс на лепшы лікпункт, ячэйку «Прэч Няпісьменнасьць» і на лепшага ліквідатара няпісьменнасьці.

Конкурс узварухнуў усю грамадзкасьць Полаччыны. Мы ўжо маем папярэднія вынікі добрай працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Вось прыклады, якія яскрава кажуць аб гэтым.

Уладычынская ячэйка «Прэч няпісьменнасьць" лічыцца адной з лепшых на Полаччыне. Яна налічвае 25 членаў, з гэтага ліку 15 актыўных таварышоў. Пры ячэйцы ёсьць розныя асьветныя і сельска-гаспадарчыя камісіі. Арганізавана па акаляючых вёсках 8 лікпунктаў, дзе вучыцца 171 чал. Уцягнута 20 батракоў.

Апрача гэтага, ячэйка вядзе і грамадзкую працу: адчынен чырвоны куток, арганізаваны сельска-гаспадарчы гурток, які налічвае 20 чал. Гурткам кіруе селянін-перадавік. Кожны месяц гурток наведвае аграном і чытае лекцыі па сельска-гаспадарчых пытаньнях. Пры ячэйцы ёсьць культурная дзялянка ў 100 дзесяцін памер. Арганізавана камісія па распаўсюджваньню друку і камісія па набыцьцю кніг сялянам.

Конкурс выяўляе працу добрых і дрэнных арганізацый па барацьбе з няпісьменнасьцю.

Сьпір. Міхальцоў.

Бабруйск справу праваліў.

Нарада ліквідатараў няпісьменнасьці гор. Бабруйску 27 лютага падагуліла працу за паўгода.

У пачатку навучальнага году былі прыняты шырокія кляны на зьнішчэньню няпісьменнасьці, намячалася ў гэтым годзе зусім зьнішчыць у горадзе няпісьменнасьць. Нарада паказала, што гэта праца праведзена толькі на 38-40 процантаў.

У пачатку навучальнага году было ўцягнута на лікпункты звыш тысячы чалавек, а зараз іх вучыцца ўсяго каля 400 чалавек, ды і тыя вучацца нерэгулярна.

Хто вінават у правале працы? Усе патроху. Вось факты:

За ўсю зіму ня было праведзена ніводнай мэтадычнай нарады працаўнікоў. Ды і ня толькі нарад, а і наогул кіраўніцтва было мала.

Гарінспэктарыят і іншыя органы ня ведаюць добра, колькі ёсьць на сёмешні дзень лікпунктаў і колькі вучыцца ў іх няпісьменных, а аб тым, як падзяляюцца вучні па сацыяльнаму становішчу, па ўзросту, полу і г. д., дык і гаварыць ня прыходзіцца—такіх зьвестак нідзе няма.

Амаль што ўсе гарадзкія лікпункты працуюць па падручніку, які прыстасован толькі да вёскі. Працаўнікі толькі скардзяцца, што ня толькі добрых падручнікаў, але і ніякіх прыладаў у краме Дзяржвыдавецтва няма.

Сродкі на ліквід. няпісьменнасьці па бюджэту (3190 руб.) расходуюцца не па плану, ды і наогул няма вестак—як выдаткованы гэтыя грошы. Колькі было сродкаў скарыстана з грамадзкага і прафсаюзнага фонду, як яны скарыстаны і колькі іх ёсьць—невядома.

Па прафсаюзнай лініі амаль уся праца зводзілася к таму, што праўленьні вывешывалі аб'явы, што будзе працаваць лікпункт, запісывайцеся. Няпісьменныя, зразумела, такіх аб'яў прачытаць не маглі.

Саюз нарпіт, мэдсантруд і інш. далі памяшканьні пад лікпункты непрыстасаваныя, сьцюдзёныя, цёмныя. Па саюзу нарпіт запісалася і вучылася спачатку 70 чалавек, а пасьля стала 9 чалавек; па саюзу мэдсантруд зусім лікпункт разваліўся.

На станцыі Бярэзіна вучыцца ўсяго 5 чалавек, а настаўнік атрымлівае па 20 руб. у месяц. Разваліўся лікпункт на цагельным заводзе. На лікпункце пры фанэрным заводзе ад холаду ў памяшканьні 10 чалавек захварэла і кінула вучыцца. Такіх зьяўішчаў шмат.

Ёсьць, зразумела, і добрыя лікпункты, напр., пры 1 школе, але ўсё-ж трэба лічыць працу наогул праваленай.

Вінаваты ў гэтым усе зацікаўленыя арганізацыі і ўстановы, нават гар. арганізацыя ЛКСМ вельмі мала вяла. Напр., ячэйка пры саюзе асьветы, якая павінна была даць прыклад, дала яго з кепскага боку.

Вопыт гэтага году трэба ўлічваць на будучы год, бо няпісьменных і ў будучым годзе мы будзем мець амаль што ня менш, чым у гэтым годзе.

Д. Абакшонак.

Ад цэмры к сьвету.

(Дрыбінскі райён, Аршаншчына).

Пасьля працы па персанальнаму ўцягненьню грамадзян у лікпункт, у гэтым годзе ўдалося адчыніць у вёсцы Асінаўцы лікпункт, дзе сталыя заняткі распачаты з 10 сьнежня.

Лікпункт працуе ў Асінаўскай школе, кіруе ім настаўніца гэтай школы А. Б. Шчарбакова.

Усяго наведвае лікпункт 14 асоб беднякоў і сераднякоў, з якіх 2 мужчыны і 12 жанчын.

Узрост іх 14-20 г. Гэтыя 14 асоб складаюць 80 проц. усяго няпісьменнага насельніцтва вёскі.

З пачатку існаваньня лікпункту заняткі праводзіліся штодня па 2 гадзіны ў дзень. Зараз—два дні ў тыдзень па 3 гадзіны ў дзень.

Ня гледзячы на аддаленнасьць хутароў ад школы і на зімовыя завеі, ня было яшчэ ніводнага выпадку, каб вучні ня прышлі на заняткі. Нават тыя дзяўчаты, якія равей баяліся сходаў і лікпункту, зараз перарадзіліся: з захапленьнем вучацца грамадзянскае ўважліва слухаюць аб сваіх жаночых правах і абавязках падтрымліваць тыя вялікія заваёвы, якія дала жанчыне савецкая ўлада.

Каб лепш замацаваць свае веды і шырэй азнаёміцца з жыцьцём іншых жанчын, вучаніцы калектыўна выпісалі часопіс «Беларуская сялянка і работніца".

З вялікім уздымам прайшло сьвята «Міжнародны Дзень Жанчын 8-га сакавіка».

Была наладжана культасьветная вечарына з удзелам школы і лікпункту, на якой пасьля дакладу настаўніцы на тэму дня і аб дасягненьні савецкай жанчыны хор са школьнікаў і лікпункту выканаў розныя песьні і перакешкай дэклямацыі вершаў аб долі жанчыны.

Настрой лікпункту бадзёры. Насельніцтва таксама задаволена.

А. Ш.

Характар, мэты і задачы вопытна-практыкавальнай школы пры пэдтэхнікуме.

Перыяд мацаненьня новых шляхоў, новай больш мэтазгоднай настаноўкі пэдагагічнай асьветы ў нас на Беларусі набывае выразныя формы. Штогодныя канфэрэнцыі-нарады па пэдагагічнай адукацыі пэдтэхнікумаў пасьля шырокіх абгаварэньняў далі адказ і ўстаноўку на цэлы шэраг актуальных пэдагагічных праблем. Зусім ясным зараз зьяўляецца пытаньне аб тыпе, задачах і структуры вопытна-практыкавальнай школы пры пэдтэхнікуме, як сур'ёзнай вучэбнай дапаможнай установы.

Пакольки пэдтэхнікум рыхтуе настаўнікаў школ 1-й ступені, вопытна-практыкавальная школа можа мысьліцца толькі як чатырохгодка. Неабходна зараз са ўсёй рашучасьцю пакінуць розныя хістаньні, імкненьні да захаваньня пры пэдтэхнікуме школы самігодкі. Які-ж аргумэнт у руках тых пэдагогаў, якія бароняць 7-ку, як вопытна-практыкавальную базу пры пэдтэхнікуме? Дадатнае тут толькі адно—непераруўнасьць працэсу падрыхтоўкі пэдагога, штогодны чарговы гатовы прыём праз сёмую групу на першы курс пэдтэхнікуму. Тут увесь працэс пэдагагічнага ўзьдзейнічаньня, усё кіраўніцтва выхаваньнем і адукацыяй будучых пэдагогаў з самых першых крокаў іх школьнага навучаньня знаходзіцца ў руках пэдагагічнай установы. Але побач з гэтым адзіна-дадатным бокам ёсьць шмат адмоўных пасьледкаў:

Вопытна - практыкавальная школа губляе выразныя мэты, зьвязаныя з мэтавай установай пэдтэхнікуму, як у сэнсе практыкуму, так і ў сэнсе навучальна-дапаможнай інстанцыі пры пэдтэхнікуме.

Стварэцца адрыў ад мас, замкнутасьць. Пэдтэхнікум задраніруецца ў межах сваёй самёхгодкі; новая плынь рабочай і сялянскай моладзі заскочыць за бартом прыёму, бо зьмяншаецца прыём з боку. Перавага даецца «сваім» вучням, са «сваёй» вопытна-практыкавальнай самёхгодкі.

Другі канцэнтр самёхгодкі засланяе сабою чатырохгодку; мала зварачаецца ўвагі на жыцьцё калектыву першага канцэнтру, забываецца ініцыятыва малодшых вучняў старэйшымі як у галіне самакіраваньня, так і ў напрамку грамадзка - карыснай працы ўстановы.

Формы дзіцячай арганізацыі ў малодшых групах толькі і могуць быць запоўнены належным зьместам пры самастойным існаваньні чатырохгодкі. Толькі тады самакіраваньне можа зрабіць вучняў актыўнымі ўдзельнікамі будаўніцтва новае школы, даць ім патрэбныя калектыўныя звычкі, прывучыць іх да грамадзкай дзейнасьці, як унутры школы, гэтак і па-за школай, па сувязі школы з навуковым жыцьцём.

Сваім аўтарытэтам, навучальнымі, вытворчымі і рабочымі плянамі настаўнікі другога канцэнтру адсоўваюць на другараднае месца вытворчыя, мэтадычныя пытаньні па праграмах першых чатырох гадоў навучаньня.

Якія ж мэты і задачы павінна ставіць перад сабою вопытна-практыкавальная школа пры пэдтэхнікуме?

Вопытная школа павінна быць ня толькі такой установай, дзе звычайна праводзіцца практыкум студэнтаў пэдтэхнікуму, але галоўнае—школаю ўжываньня новых мэтадаў, новай арганізацыі школьнай працы, школаю ўмелае арганізацыі дзіцячага калектыву, рацыянальнай грамадзка-карыснай чыннасьці і г. д. Гэта ня толькі база старой трэніроўкі, дзе даюцца пробныя ўрокі і набываюцца звычкі выкладаньня. Старыя традыцыі мінулых настаўніцкіх інстытутаў і сэмінарый павінны назаўсёды адыйсьці ў нябыцьцё.

Вопытна-практыкавальная школа павінна быць навуковай працоўнай школай першай ступені, рабочай лябараторыяй для студэнта. Яна павінна навучыць яго, як будучага пэдагога пасавай школы, працаваць ва ўмовах, у такіх абставінах, якія будуць блізкімі да яго будучай працы. Сыстэма злучаных груп павінна тут пакуль што практыкавацца, бо наша рэчаіснасьць яшчэ не дазваляе на вёсцы мець усюды чатырохкамплектныя школы. Адсюль вопытна-практыкавальная школа павінна даць вопыт пабудовы нармальнай працоўнай школы на матар'яльным базісе школы масавай.

Вопытная школа, як паказальная, вядзе за сабою радавыя школы, а таму ня можа быць бескаляровая. Ад яе чакаюць узорнай арганізацыйнай пастаноўкі школьнай працы і выкарыстоўваньня найноўшых мэтадаў і дасягненьняў пэдагагічнага вопыту, выпікаў злучэньня тэорыі і практыкі ва ўмовах данай, скажам, акругі.

Як вопытная лябараторыя, як база, дзе магчымы шырокіх экспэрымэнты, практыкавальная школа ёсьць цэнтр прапаганды сярод акаляючага насельніцтва ідэй новай школы, дасягненьняў сучаснай пэдагогікі і пэдалёгіі. Правядзеньне дакладаў, выставак, канфэрэнцый і г. д.—вось тыя формы, праз якія павінна ісьці ўвязка.

Вопытна-практыкавальная школа будзіць пэдагагічную думку, упарта расьцярэблівае сьцежкі да працоўнай школы шляхам прапрацоўкі праграм НКА, «гусаўскіх» на месцовым краязнаўчым зьнесьце.

Пэдтэхнікум і практыкавальная школа праз мэтадычнае бюро пры інспэктарыяце асьветы, а таксама і непасрэдна даюць мэтадычнае кіраўніцтва і кансультацыю для школ райёну.

Школа пры пэдтэхнікуме абавязана задавольваць запытаньні і запатрабаваньні месцовых школ па формах арганізацыі дзіцячага аспродзьдзя, на ўвязцы фактараў месцовага жыцьця са зьместам комплексу; павінна даць стымулы і зьмест па краязнаўчай дзейнасьці школ; на практычным матар'яле знаёміць з увязкай навыкаў па комплексу і г. д., а таксама павінна дзяліцца вынікамі сваёй працы са школамі раёну, выкарыстоўваючы дзеля апошняга мясцовую прэсу, настаўніцкія райённыя канфэрэнцыі, трымэстравыя выстаўкі.

Пакольки пэдтэхнікум павінен быць аспродзьдзем падвышэньня кваліфікацыі масавага настаўніцтва, і зараз зусім слушна высоўваецца думка, што лепш занест летніх курсаў па перападрыхтоўцы настаўнікаў арганізоўваць курсы пры пэдтэхнікуме дзеля перакваліфікацыі настаўнікаў,—вопытна-практыкавальная школа будзе тым месцам, дзе разгорнуцца індывідуальныя і групавыя заняткі з настаўнікамі. Курсы павінны функцыянаваць на працягу ўсяго навучальнага году і абслугоўваць райён, або нават і акругу.

20-25 настаўнікаў працуюць 5-6 тыдняў, потым новая зьмена. Пры вопытна-практыкавальнай школе яны праводзяць комплексны практыкум. Месячная іх практыка пры школе эпізадычна-разгорнутай сыстэмай—гэта сапраўднае пэдагагічнае амалажэньне.

Вопытна-практыкавальная школа шырока вядзе пэдалёгічнае вывучэньне дзіцяці, як з боку яго фізычнага разьвіцьця, так і з боку псыхічнага. Калектыўнае тэставаньне аб'ектаў нагляданьня, індывідуальнае тэставаньне іх па вывучэньню агульнай і спэцыяльнай адоранасьці, мэтодыка тэставаньня, самыя камплекты тэстаў на поўны ўзрост, мэтодыка статыстычнае апрацоўкі тэстаў, мэтодыка сацыяльна-бытавога дасьледваньня, стандарты да тэстаў,—усё гэта праз вопытна-практыкавальную школу павінна быць здабыткам масавага настаўніцтва райёну ці акругі.

Пакольки пэдтэхнікум рыхтуе масавага настаўніка, якому прыдзецца працаваць, галоўным чынам, на вёсцы,—пры вопытна-практыкавальнай школе павінен быць зямельны вучастак, жывая лябараторыя, майстэрня прыроды. Тут з дасьцямі магчыма праводзіць назіраньні, досьледы, вопыты. Таксама студэнт пэдтэхнікуму практычна свае тэаретычныя веды па энцыклёпэдыі сельскай гаспадаркі зможа прыкласьці на справе арганізацыі зямельнай дзялянкі пры школе плошчаю хоць бы ў адзін гектар. Ужо на такой плошчы ў поўнай меры можна арганізаваць садоўніцтва з тэхнічнай перапрацоўкай плодоў, гарадніцтва з парніковаю гаспадаркаю. Далей, адзін зямельны вучастак можа насіць вытворчы характар, другі—вопытны (вопытныя градкі), там пітомнік, пчэльня, калі магчыма, кампостная куча і г. д.

Можна нават уводзіць некаторыя досьледы з мінэральнымі ўгнаеньнямі і вывучэньне відаў севазваротаў, дзе дазваляюць умовы і зямельная плошча Усё гэта, праўда, у мініятуры, але пры ўменьні можа прынесьці шмат карысьці, можа падказаць маладога пэдагога аграномічнымі ведамі, якія ён скарыстае ў той школе, дзе будзе працаваць. Вопытна-практыкавальная школа навочна павінна яго гэтаму навучыць, павінна прышчапіць яму звычкі, як выхоўваць моладзь у новым калектыўным духу.

Такавы асноўныя патрабаваньні, якія сучаснасьцю высоўваюцца да вопытна-практыкавальнай установы пры пэдтэхнікуме.

З аднаго боку, школа—база практычнае працы студэнтаў, дзе яны непасрэдна вывучаюць пэдагагічны працэс працы, дзе, як у лябораторыі, разьвязваюцца практычныя мэтадычныя, арганізацыйныя, пэдагагічныя і пэдалёгічныя праблемы, якія стаяць у цэнтры навукова-дасьледчай і навучальнай працы пэдтэхнікуму; з другога боку—вопытна-практыкавальная школа абавязана быць жыцьцёва-здольным, карысным апаратам, як вышэй адзначана, для масавага настаўніцтва. Толькі пры памянёных умовах яна апраўдае св

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб зацьверджаньні Палажэньня аб членах Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць наступнае Палажэньне аб членах Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР і скасаваць Палажэньне аб членах і кандыдатах у члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ад 3 лістапада 1924 году. (Збор З. БССР ва 1924 г. № 27, арт. 235).

2. Паляць гэту пастанову на зацьверджаньне Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР на бліжайшай Сэсіі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

23 лютага 1929 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об утверждении Положения о членах Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

1. Утвердить следующее Положение о членах Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР и отменить Положение о членах и кандидатах в члены Центрального Исполнительного Комитета БССР от 3 ноября 1924 г. (Собр. З. БССР за 1924 г. № 27, ст. 235).

2. Представить это постановление на утверждение Центрального Исполнительного Комитета БССР на ближайшей Сессии.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

23 февраля 1929 г.
г. Минск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

аб членах Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

1. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і кандыдаты да іх выбіраюцца на Усебеларускім Зьезьдзе Саветаў на тэрмін да наступнага чарговага Усебеларускага Зьезду Саветаў.

2. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту маюць права законадаўчай ініцыятывы і права запросаў на сесійных (пленарных) пасяджэньнях Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

3. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту павінны прысутнічаць на ўсіх пасяджэньнях Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР і яго камісій у якія яны выбраны, а таксама выконваць асобныя даручэньні Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

У тых выпадках, калі члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту не могуць прысутнічаць на пасяджэньнях Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, яго камісій, або выконаць дадзеныя ім асобныя даручэньні, яны абавязаны паведамляць аб прычынах няяўкі або невыкананьня Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

4. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту маюць права прысутнічаць з дарадчым голасам на пасяджэньнях Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР, а таксама на ўсіх пасяджэньнях і нарадах цэнтральных і мясцовых органаў савецкай улады, дзяржаўных, устаноў і грамадзкіх арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларускае ССР і ўзьнімаюць пытаньне аб аказаньні незакономерных пастаноў і дзеяньняў і абскардзіць апошнія ў вышэйшыя органы.

5. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, на паказаньні сваіх пасьведчаньняў, маюць права вольнага ўваходу на ўсе савецкія ўстановы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларускае ССР, а таксама права атрымоўваць ад ўсіх савецкіх і грамадзкіх установаў і арганізацыяў неабходныя ім вывесткі і даведкі, апроч сакрэтных, для атрыманьня якіх неабходзен асобны дазвол старшыні альбо сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

6. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту могуць выступаць ад імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту толькі ў тых выпадках, калі яны будуць упаўнаважаны на гэта Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

7. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту абавязаны знаёміць працоўных з работай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і з пытаньнямі, якія абгаварваюцца на яго пасяджэньнях.

8. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту за ўвесь час сваёй работы павінны падтрымліваць пісьмовую сувязь з Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

Увага: Службовая карэспандэнцыя, якая пасылаецца членамі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ў адрас Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР, прымаецца паштовымі ўстановамі бясплатна і аплачваецца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту за ўстаноўленым парадку.

9. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, якія пасылаюцца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР у камандыроўку, атрымоўваюць адведныя мандаты і павінны пасьля звароту падаць даклад аб сваёй паездцы.

10. Парадак аплаты членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту вызначаецца асобнай пастановай Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

11. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту выклікаюцца для допыту ў якасьці сьведак судовымі альбо адміністрацыйнымі органамі ў агульным парадку.

У выпадку немагчымасьці зьявіцца на допыт члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, паведамляючы аб прычынах сваёй няяўкі, могуць прасіць аб допыце іх на месцы іх службы або на даму.

У асобна выключных выпадках, калі члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту па тых ці іншых матывах будзе лічыць для сябе немажлівым даваць паказаньні, ён паведамляе аб гэтым судовыя або сьледчыя органы і адначасова Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

12. Судова-сьледчыя органы не маюць права ўжываць да членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прадугледжаныя адведнымі артыкуламі Крымінальна-Працэсуальнага Кодэксу Беларускай ССР меры супроць няяўкі сьведкаў і абавязаны зьвярнуцца ў гэтых выпадках у Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР за належнымі паказаньнямі.

13. Справы аб злачынствах і службовых недахопах членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту могуць быць распачаты толькі з дазволу Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

14. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту на могуць быць зьняты з пасады ў сувязі з распачатай супроць іх судовай справай, на могуць быць арыштаваны і затрыманы, абшуканы і абгледжаны судовымі, сьледчымі або адміністрацыйнымі органамі без спецыяльнае пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

У асабліва экстраных выпадках ужываньне вышэйпаказаных мер можа мець месца са згоды Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, з наступным яго дакладам аб гэтым на бліжайшым пасяджэньні Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

15. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту могуць быць аддадзены пад суд або на іх накладзена адміністрацыйнае ўзьсканьне толькі па пастанове Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР з дакладам аб гэтым Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту на бліжэйшай Сэсіі.

Окончаныя матар'ялы расьледваньня па справах, па якіх члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прыцягваюцца да адказнасьці, павінны падавацца папярэдне ў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР. Вырашэньне пытаньняў аб адданьні пад суд або аб накладаньні адміністрацыйнага ўзьсканьне можа мець толькі пасьля запатрабаваньня ад абвінавачаемага асабістай яўкі або пісьмовых тлумачэньняў на запытаньні Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

16. Выключэньне са складу членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту вытвараецца Усебеларускімі Зьездамі Саветаў і ў выключных выпадках Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Беларускае ССР, з падачай адбыўшайся пастановы аб выключэньні на канчатковае зацьверджаньне бліжэйшага Усебеларускага Зьезду Саветаў.

17. Выбыўшыя па якіх-небудзь прычынах са складу Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР члены замяняюцца кандыдатамі ў парадку іх выбіраньні па пастанове Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту

18. Члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, якія не зьявіліся на Сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР, замяняюцца на час Сэсіі кандыдатамі, прычым у гэтых выпадках кандыдаты атрымоўваюць права пастаноўчага голасу.

19. Кандыдаты ў члены Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, калі яны не замяняюць членаў (арт. арт. 17 і 18) карыстаюцца на ўсіх пасяджэньнях Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР правам дарадчага голасу.

20. На кандыдатаў распаўсюджваюцца ўсе правы і абавязкі, устаноўленыя гэтым палажэньнем для Членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

23 лютага 1929 г.,
г. Менск.

ПОЛОЖЕНИЕ

о членах Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

1. Члены Центрального Исполнительного Комитета и кандидаты к ним избираются на Всебелорусском С'езде Советов на срок до следующего очередного Всебелорусского С'езда Советов.

2. Члены Центрального Исполнительного Комитета имеют право законодательной инициативы и право запросов на сессионных (пленарных) заседаниях Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

3. Члены Центрального Исполнительного Комитета должны присутствовать на всех заседаниях Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР и его комиссий, в которые они избраны, а также выполнять особые задания Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

В тех случаях, когда члены Центрального Исполнительного Комитета не могут присутствовать на заседаниях Центрального Исполнительного Комитета, его комиссий или выполнить данные им особые задания, они обязаны сообщить о причинах неявки или невыполнения Президиуму Центрального Исполнительного Комитета.

4. Члены Центрального Исполнительного Комитета имеют право присутствовать с совещательным голосом на заседаниях Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР, а также на всех заседаниях и совещаниях центральных и местных органов советской власти, государственных учреждений и общественных организаций, находящихся на территории Белорусской ССР и возбуждать вопросы об отмене незакономерных постановлений и действий и обжаловать последние в высшие органы.

5. Члены Центрального Исполнительного Комитета, по пред'явлении своих удостоверений имеют право свободного входа во все советские учреждения, находящиеся на территории Белорусской ССР, а также имеют право получать во всех советских и общественных учреждениях и организациях необходимые им сведения и справки, кроме секретных, для получения коих необходимо особое разрешение Председателя или Секретаря Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

6. Члены Центрального Исполнительного Комитета могут выступать от имени Центрального Исполнительного Комитета только в тех случаях, когда они будут уполномочены на это Президиумом Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

7. Члены Центрального Исполнительного Комитета обязаны знакомить трудящихся с работой Центрального Исполнительного Комитета и с вопросами, обсуждающимися на его заседаниях.

8. Члены Центрального Исполнительного Комитета на все время своей работы должны поддерживать письменную связь с Президиумом Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

Примечание: Служебная корреспонденция, посылаемая членами Центрального Исполнительного Комитета в адрес Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР, принимается почтовыми учреждениями бесплатно и оплачивается Президиумом Центрального Исполнительного Комитета в установленном порядке.

9. Члены Центрального Исполнительного Комитета, отправляемые Президиумом Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР в командировку, получают соответствующие мандаты и должны по возвращении представить доклад о своей поездке.

10. Порядок оплаты членов Центрального Исполнительного Комитета определяется особым постановлением Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

11. Члены Центрального Исполнительного Комитета вызываются для допроса в качестве свидетелей судебными или административными органами в общем порядке.

В случае невозможности явиться на допрос члены Центрального Исполнительного Комитета, сообщая о причинах своей неявки, могут просить о допросе их по месту их службы или на дому.

В особо исключительных случаях, если член Центрального Исполнительного Комитета по тем или иным мотивам будет считать для себя невозможным дать показания, он сообщает об этом судебным или следственным органам и одновременно Президиуму Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

12. Судебно-следственные органы не имеют права применять к членам Центрального Исполнительного Комитета предусмотренные соответствующими статьями Уголовно-Процессуального Кодекса Белорусской ССР меры против неявки свидетелей и обязаны обратиться в этих случаях в Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР в надлежащими указаниями.

13. Дела о преступлениях и служебных упущениях членов Центрального Исполнительного Комитета могут быть начаты только с разрешения Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

14. Члены Центрального Исполнительного Комитета не могут быть остранены от должности в связи с возбуждаемым против них судебным делом, не могут быть подвергнуты аресту и задержанию, обыску и осмотру судебными, следственными или административными органами без специального постановления Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

В особо экстренных случаях применение вышеуказанных мер может иметь место с согласия Председателя Центрального Исполнительного Комитета, с последующим его докладом об этом на ближайшем заседании Президиума Центрального Исполнительного Комитета.

15. Члены Центрального Исполнительного Комитета могут быть преданы суду или подвергнуты административному взысканию только по постановлению Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР с докладом об этом Центральному Исполнительному Комитету на ближайшей Сессии.

Законченные материалы расследования по делам, по которым члены Центрального Исполнительного Комитета привлекаются к ответственности, должны представляться предварительно в Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР. Разрешение вопросов о предании суду или о наложении административного взыскания может иметь место только после истребования от обвиняемого личной явки или письменных об'яснений по запросу Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

16. Исключение из состава членов Центрального Исполнительного Комитета производится Всебелорусскими С'ездами Советов и в исключительных случаях Центральным Исполнительным Комитетом Белорусской ССР, с представлением состоявшегося постановления об исключении на окончательное утверждение ближайшего Всебелорусского С'езда Советов.

17. Выбывшие по каким нибудь причинам из состава Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР члены заменяются кандидатами в порядке их избрания по постановлению Президиума Центрального Исполнительного Комитета.

18. Члены Центрального Исполнительного Комитета, не явившиеся на Сессию Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР, заменяются на время Сессии кандидатами, причем в этих случаях кандидаты получают право решающего голоса.

19. Кандидаты в члены Центрального Исполнительного Комитета, если они не заменяют членов (ст. ст. 17 и 18) пользуются на всех заседаниях Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР правом совещательного голоса.

20. На кандидатов распространяются все права и обязанности, установленные настоящим Положением на членов Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

23 февраля 1929 г.
г. Минск.

Галоўлітбел 595.

ХРОНІКА.

АНТЫСЭМІТЫЗМ СЯРОД ПРАЦАЎНІКОЎ МАЗЫРСКАЙ П.-Т. КАНТОРЫ.

Прэзыдыум ЦП саюзу сувязі разглядзеў пытаньне аб выпадках антысэмітызму ў Мазырскай паштова-тэлеграфнай канторы. З матар'ялаў відаць, што факты антысэмітызму мелі месца, а апруговае аддзяленьне саюзу на іх не рэагавала. На нат старшыня акраддзяленьня т. Бурдо прысутнічаў пры некаторых фактах антысэмітызму і ніякіх мер ня прыняў. Мазырскае акрпрафбюро пастанавіла лічыць неабходным зьняць з працы т. Бурдо і датэрмінова пераабраць акраддзяленьне саюзу сувязі. Адзначыла акрпрафбюро і тое, што ў паштова-тэлеграфнай канторы сярод працаўнікоў ёсьць антысавецкія элементы.

Прэзыдыум ЦП саюзу агадзіўся з пастановай акрпрафбюро і ўказаў, што апруговы зьезд саюзу сувязі адбудзецца 3 красавіка, калі акраддзяленьне і будзе пераабрана. Побач з гэтым ЦП саюзу лічыць вельмі патрэбным правесьці праверку штатаў паштовай канторы. Акраддзяленьню саюзу даручана аказаць у гэтым напрамку садзейнічаньне РСІ.

Дзе будуць працаваць дзяржтэатры ў 1929-30 годзе.

Калегія НКА зацьвердзіла плян працы дзяржаўных тэатраў на зімовы сэзон 1929-30 году. Першы Дзяржаўны Беларускі тэатр увесь зімовы сэзон будзе працаваць у г. Гомелі.

Другі Белардзяржтэатр і Беларускі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр будуць па палове сэзону працаваць у Менску і Віцебску.

Галоўмастацтву даручана высьветліць магчымасьць адначасовай працы абодвых тэатраў у Менску.

Рэформа яўрэйскай артаграфіі.

На ўсесаюзным зьезьдзе яўрэйскіх культпрацаўнікоў, які адбываўся ў Харкаве, была прынята пастанова аб рэформе яўрэйскай артаграфіі.

Калегія Наркамасьветы БССР, адзначаючы вялізарнае практычнае і цэлітычнае значэньне рэформы яўрэйскай артаграфіі, зацьвердзіла пастанову па гэтаму пытаньню Усесаюзнага зьезду яўрэйскіх культпрацаўнікоў.

Побач з гэтым калегія Наркамасьветы лічыць неабходным увесьці новую артаграфію ў школах з наступнага 1929-30 навучальнага году.

Прызнаючы неабходным увядзеньне новай артаграфіі адначасова ва ўсім Савецкім Саюзе, калегія НКА пастанавіла узгадніць гэта пытаньне з наркамасьветамі іншых саюзных рэспублік.

Рабочых на адказныя пасады.

У апошні час партыйна-савецкія арганізацыі Гомельшчыны шмат увагі аддаюць прадвядзеньню рабочых у савецкі апарат. Рабочыя ад варштату выкідваюцца на кіруючую працу. Гэтымі днямі вылучаны рабочы галоўных майстэрняў т. Шчэрбакоў на пасаду намесьніка загадчыка акрзе'маддзелу. Тав. Шчэрбакоў у першыя-ж дні сваёй працы накіраваў сваю ўвагу на ход вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Абслугоўваньне рабочых-будаўнікоў.

ЦП саюзу будаўнікоў адпусьціла 1500 р. на арганізацыю перасовачных бібліятэчак для абслугоўваньня рабочых-будаўнікоў на будаўнічых работах.

Доля лешняга зьбіраньня і захаваньня сродкаў на ўсіх буйнейшых пунктах будаўнічых работ будуць арганізаваны касы ашчаднасьці.

На адрамантаваньне забранай сінагогі ў Полацку, дзе будзе арганізаваны клюб будаўнікоў, ЦП саюзу адпусьціла 2000 рублёў.

Буйныя работы на Менскай Расьліневодной станцыі.

На тэрыторыі былой Малой Сьлепні адводзіцца 226 гэкт. пад асноўную базу Менскай Расьліневодной Дасьледчай Станцыі. Узьнята хадайніцтва перад СНК БССР аб водпуску 280000 руб. на будаўніцтва, якое павінна распачацца ў сёлетнім годзе, каб у 1930 г. г. зн. да часу арганізацыі Усебеларускай с.-г. выстаўкі, станцыя магла дэманстраваць шэраг пытаньняў, зьвязаных з рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі і падвышэньнем ураджайнасьці.

Другі традыцыйны вечар на карысьць дзяцей Зах. Беларусі.

4 красавіка г. г. ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу арганізуе 2-гі традыцыйны вечар на карысьць дзяцей рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

У арганізацыі вечару прымуць удзел беларускія пісьменьнікі і артысты, Дзіцячая Камісія—ЦВК, Мастацкінуш, БДТ1 Дзяржаўная Капэла і інш.

Вясеньнія канікулы ў сямёхгодках.

Вясеньнія канікулы ў польскіх школах-сямёхгодках вызначаны НКА на час з 8 да 14 красавіка.

Ва ўсіх іншых школах-сямёхгодках вясеньнія канікулы адбудуцца ў нерыяд з 1 да 7 красавіка.

У пачатковых школах вясеньняга перапынку ня будзе.

Арганізаваны акруговы аддзел РСІ.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому загадчыкам акруговага аддзелу РСІ абраў т. Дамброўскага і яго намесьнікам т. Жуковіча. Членамі калегіі аддзелу зацьверджаны т. т. Шаўноў, Дашыц—рабочы заводу „Энэргія" і т. Позьняк.

Аб часовых працаўніках.

Наркампрацы БССР даў указаньні аб тым, што калі асобы, прынятыя на часовую працу праз біржу працы, застаюцца па скачэньні яе працаваць там-жа і на той-жа спэцыяльнасьці, дык гэта ня трэба афармляць праз біржы працы. Калі-ж працаўнікі, прынятыя на часовую працу, застаюцца працаваць і надалей, але на іншай спэцыяльнасьці, дык застаўленьне іх на работу неабходна афармляць праз біржы Працы.

Азнаямленьне з яўрэйскімі калгасамі.

Культкамісія ЦП «Аэзту» пастанавіла арганізаваць 2 экскурсіі для азнаямленьня з яўрэйскімі калгасамі БССР.

Экскурсіі адбудуцца ў хуткім часе.

Падвышэньне кваліфікацыі інструктароў фізкультуры.

ЦП саюзу працаўнікоў Асьветы наладзіла цэлы шэраг лекцый па педалёгіі, анатоміі і фізіялёгіі, а таксама і на тэмы бягучага дню для інструктароў фізкультуры—членаў саюзу асьветнікаў. Лекцыі будуць чытацца кожную нядзелю.

Побач з гэтым пры Доме Асьветы адчыняецца курс фізкультуры і спорту, дзе інструктары фізкультуры будуць мець магчымасьць падвышаць сваю кваліфікацыю.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 26 САКАВІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	4—83,5	—
2-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	5—00	—
Бясспрод. пазыка 26 г.	121—75	123—75.
10-проц. дзярж. выйгрышная пазыка 27 г.	25—39	25—49
6-я дзяр. індустрыял.	25—82,5	25—92,5
3-я сялянская 1927 г.	5—04,5	— —
12-проц. рэнтн. 1927 г.	103—80	— —
2-я пазыка індустрыял. проц. выш.	26—25	26—35.
2-я індустрыял. бясспрод.	25—87	25—97.
11 проц. унутран.	100—73	100—78

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

ПАВАЖАНЫ т. РЭДАКТАР!

Просім зьмясьціць у вашай газэце наступнага зьместу пастанову агульнага сходу аб'яднаньня пісьменьнікаў «Полымя» ад 24 сакавіка 1929 г.

Аб'яднаньню пісьменьнікаў «Полымя» стала вядома, што ў апошні час членам гэтага аб'яднаньня Алесем Дударом напісан і пушчан на руках у рукапісным відзе антысавецкі, контр-рэвалюцыйны па зьместу верш.

Апошнія як публіцыстычныя, так і белетрыстычныя творы А. Дудара (Т. Глыбодката) паказвалі ідэалёгічныя хіснаньні аўтара. Аднак, Аб'яднаньне «Полымя» не чакала ад А. Дудара, які, уступаючы ў аб'яднаньне, цалкам падзяляў асноўныя прынцыпы апошняга („разьвіцьцё беларускай мастацкай літаратуры шляхам узмацненьня творчае працы сваіх сяброў і ў шчыльнай сувязі з вымаганьнямі сацыялістычнага будаўніцтва; афарбленьне і замацаваньне ў беларускай мастацкай літаратуры пралетарскай ідэалёгіі, зьвязваючы гэта з разьвіцьцём і ўдасканаленьнем нацыянальнай формы; удасканаленьне і паглыбленьне літаратурнай творчасьці, шляхам разьвіцьця [illegible] і г. д."), што ён адыдзе ад гэтых прынцыпаў і накіруе сваю творчасьць супроць палітыкі савецкай улады і камуністычнай партыі.

Асуджаючы гэты ўчынак А. Дудара, як чужы, варожы прынцыпам аб'яднаньня, настрою і думкам яго членаў, агульны сход «Полымя» лічыць раз падкрэсьлівае пункт статуту аб'яднаньня, што: «аб'яднаньне будзе весьці барацьбу па шкодных ўхілах, якія могуць вынікнуць на шляху будаваньня беларускай пралетарскай літаратуры", і пастанаўляе—выкінуць А. Дудара з арганізацыі „Полымя".

Прэзыдыум «Полымя»:

Старшыня—Цішка Гартны.

Члены—Якуб Колас, М. Чарот

Сакратар—В. Сташэўскі.

Рабселькоры, на антырэлігійны фронт!

Зараз праводзіцца генэральны агляд антырэлігійнай работы. Гэты агляд павінен ахапіць работу як саюзу бязбожнікаў, так і ўсіх культурна-асьветных устаноў.

Ня гледзячы на тое, што агляд пачаўся з 15 сакавіка і павінен скончыцца 15 красавіка, рабселькоры лічна не раскачаліся. Аглядавыя матар'ялы паступаюць вельмі марудна і ў нязначнай колькасьці. Уся вастрата гэтага пытаньня, відаць, яшчэ ня ўяўлена, а разам з гэтым ня ўяўлена і тая вялікая шкодніцкая антысавецкая работа, якая ў сучасны момант вядзецца рознымі рэлігійнымі арганізацыямі. Нашы дасягненьні на фронце сацыялістычнага будаўніцтва і рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы выклікаюць нездавальненьне з боку нашых ворагаў, якія адкрыта і маскіруючыся пад рознымі рэлігійнымі шыльдамі перашкаджаюць гэтаму будаўніцтву.

«Рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы выклікала абастрэньне клясавай барацьбы і тут у дапамогу тым, хто жадае затрымаць наступленьне, хто перашкаджае нашай барацьбе за новага чалавека, значную ролю адыгрываюць усялякія рэлігійныя групы, сэкты і г. д., якія часамі набываюць антысавецкі характар.

«Усё гэта патрабуе ад бязбожнікаў шырокай выхаваўчай штодзённай антырэлігійнай работы ў школе, клюбе, хаце-чытальні, чырвоным кутку, паасобным хатам сялян і агульным памяшканьням, у якіх жывуць рабочыя фабрык, і заводаў рабочыя сезоньнікі і г. д."

—Так гаворыцца ў адкрытым лісьце АППА ЦК КП(б)Б і Цэнтральнага Савету Бязбожнікаў, надрукаванай у нашай газэце 15 сакавіка. Гэты ліст павінен быў і бяз гэтага ўскалыхнуць рабселькораўскія масы і завастрыць увагу на гэтым пытаньні. Пікавага ўпушчэньня тут быць не павінна.

Рабселькоры ў часе агляду павінны праверыць выкананьне гэтай работы ўсімі азначанымі арганізацыямі і ўстановамі і шырока высьветліць вынікі ў друку, ня скрываючы як дасягненьняў так і недахопаў. Неабходна ўважлівая праверка сапраўднага ахапленьня працоўных мас антырэлігійнай работай. Зьвярніце больш увагі на гэту работу. Пасьпяхова правёўшы гэты агляд, мы дапаможам узмацненьню антырэлігійнай работы, а разам з гэтым расчысьцім шлях для ажыцьцяўленьня лёзунгу культурнай рэвалюцыі.

Рабселькоры, на антырэлігійны фронт!

Я. Чарнецкі.

Любімчык начальніка.

Ужо больш году, як па пратэкцыі начальніка Кахонаўскага паштовага аддзяленьня Палкоўскага ўзяты на службу лістаносцам на Аленаўскі с.-с. заможны селянін Эляшкевіч. Гэты Эляшкевіч справаю лістаносца зусім ня цікавіцца. Газэты і іншую карэспандэнцыю дастаўляе несваечасова і аддае каму прыдзецца, дзякуючы чаму апошняя на палову не попадае адрасату.

Сяляне кажуць, што сьвежымі газэтамі дзякуючы такому лістаносцу заварачваюць селядцы ў крамах. Трэба ад такога лістаносца найхутчэй вызваліцца.

Ваўчок і Пятроўскі.

Што слухаць па радыё.

АЎТОРАК, 19-га САКАВІКА.

17-40—7-я лекцыя з сялянамі з цыклю: „За ўраджай".
1. Роля с.-г. машын у падвышэньні ўраджайнасьці.
2. Гутарка па вэтэрынарыі.
18-20—Музычны адпачынак.
18-55—Даклад аб выніках XII зьезду па 5 гадовану плану.
19-25—Беларуская радыёгазэта.
20-15—Інфармацыя на мове эсэперанто.
20-50—Канцэрт.
23-00—23-20—Агляд заўтрашняй прэсы.

СЕРАДА, 20 САКАВІКА.

17-40—Гутарка з настаўнікам і хатнікам.
18-00—Гутарка ўрача.
18-25—Радыёгазэта для сельгаспрацоўнікаў «Беларускі Батрак».
19-05—Гутарка ад камсамолу на антырэлігійную тэму.
19-25—Беларуская радыёгазэта.
20-10—Музычны адпачынак.
20-30—Лекцыя рабфака-сялянскага радыёуніверытэту (падрыхтоўчы курс) па політпрадметах. Выкл. Амбрасенак.
21-20—Канцэрт.
23-30—23.50—Агляд заўтрашняй прэсы.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня 26-3 а 7-й гадз. увечары адбудуцца заняткі ячэйкі КП(б)Б Працаасьветы па расарэнаўцы праграм і пастаноў 6-га Кангрэсу Камінтэрну.

Прысутнасьць абавязковая ўсіх кандыдатаў ячэйкі—абавязкова.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У аўторак, 26-3 г. г. роўна ў 7 гадзін увечары адбудзецца сход выкладчыкаў прыродазнаўства школ г. Менску.

На парадку дня стаяць наступныя пытаньні:
1. Аб узьнаўленьні ўраджайнасьці.
2. Аб шаўкоўніцтве.
Яўка абавязкова.

—У серраду, 27-3 а 7 гадз. увечары, у Пэдгабінэце пры доме Асьветы адбудзецца сход секцыі па палавому выхаваньню. Праца будзе весьціся па падсэкцыях. Просьба да ўсіх сакцыі зьявіцца.

У аўторак, 26-3 г. г. роўна ў 7 гадзін увечары сход загадчыкаў школ гор. Менску.

На абмеркаваньне:
1) аб узьнаўленьні ўраджайнасьці;
2) аб узаемаадносінах між настаўнікамі і вучнямі;
3) аб дню лесу.
Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
АЎТОРАК, 26-га САКАВІКА
Для ЛКСМБ ФРУНЗ. РАЙЁНУ
МОСТ (на шляхох індустрыялізацыі).
Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка, 26 сакавіка ЗА МАНАСТЫРСКАЙ СЬЦЯНОЙ".

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 26 сакавіка. Выключны мастацкі баявік „НЕПЕРАМОЖНЫЯ" Драма ў 7 частках. Пачатак у 6 г. 30 хв.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ З аўторка, 26 сакавіка „КАПРЫЗ КАЦЯРЫНЫ II-й"

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». З аўторка, 26 сакавіка „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА" 2-я серыя ў 6 частках.

МАЗЫРСКІ ПЭДТЭХНІКУМ
прызначае на 10-е красавіка 1929 году, а 12-й гадзіне дню, у ПАМЯШКАНЬНІ ПЭДТЭХНІКУМУ
(Мазыр, Ленінская № 7)
ТАРГІ на здачу з падраду работ па грунтоўнаму рамонту будынкаў тэхнікуму ў г. Мазыры.
Кошт рамонту (матар'ялы, рабочая сіла і налічэньні) каля 15.000 руб.
Азнаёміцца з каштарысам і даведкі можна ў канцэлярыі тэхнікуму.
ПІСЬМОВЫЯ ЗАЯВЫ АДРАСАВАЦЬ:
„Мазыр, пэдтэхнікум, да таргоў 10-га красавіка".
Не падаўшыя пісьмовых заяў да таргоў не дапускаюцца. Да таргоў патрэбна ўнесьці ня менш 1.500 руб. залогу ці прадставіць квітанцыю аб уносе гэтай сумы ў Дзяржбанк. Ад залогу ослабаняюцца каапэрацыйныя арганізацыі і акцыянэрныя таварыствы з перавагаю дзяржаўнага і каапэрацыйнага капіталу.
Дырэктар тэхнікуму Н. СМАЖЭЎСКІ.

ВЫШЛА З ДРУКУ, РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ І ПРАДАЕЦЦА Ў КНІГАРНЯХ
№ 2 УЗВЫШША № 2
У НУМАРЫ ЗЬМЕШЧАНЫ НАСТУПНЫЯ РЭЧЫ:
ЯЗЭП ПУШЧА—Маўклівая радасьць мая (верш). КУЗЬМА ЧОРНЫ—Ліст Якуба Мальковіча (апавяданьне). УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА—У пурпуровых вогравей узьвіны (паэма). ЛУКАШ КАЛЮГА—Трахім-лятучы чалавек (апавяданьне). МАКСІМ ЛУЖАНІН—Два вершы (вершы). УЛАДЗІМЕР ЖЫЛКА—Пад калыскаю (верш) ПЯТРО ГЛЕБКА—Эміграцыя, Песьня каханьню (вершы). А. МРЫЙ—Рабіна (апавяданьне). УЛАДЗІМЕР ХАДЫКА—У мораку, Пад кіёнамі (вершы) Т. ТРЫКЛІНІ—Казкі для малых і вялікіх (вершы) І. ПЛАШЧЫНСКІ—Да пытаньня спэцыфікуму літаратуры (артыкул).
КУЛЬТУРА МОВЫ:
УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА—Падоўжаныя (або падвойныя) вычныя і спосаб іх азначэньня на пісьме (артыкул). М. КАРПОВІЧ—Пра слова „вытвараць".
СЛОВА—ЧЫТАЧУ:
Г. С.—Апавяданьні Васіля Кавала. ЧАРНЯЎСКІ—Пра „Узвышша" і паэтаў. СЬ